PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 50 (2431) Год XLVII | Беласток, 15 снежня 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Беларусь і пагранічча

Паўліна Шафран

28 лістапада, ў рамах беларускіх чацвяргоў, якія ладзіць Кафедра беларускай культуры Беластоцкага універсітэта адбылася прамоцыя кніжкі прафесар Альжбеты Смулковай *Białoruś i pogranicza. Studia o języku i społeczeństwie*.

Галоўным рэцэнзентам кніжкі быў прарэктар Беластоцкага універсітэта прафесар Багуслаў Нававейскі.

Кніжка, названая самой аўтаркай „апаслым тамішчам", падзелена на тры часткі. Першая з іх прысвечана навуковым зацікаўленням аўтаркі, перш за ўсё марфалагічным праблемам, якіх апрацоўку прарэктар Нававейскі назваў „удалай экспедыцыяй на гімалайскую вяршыню".

Другая частка датычыць навуковага жыцця, у якім аўтарка прымала і прымае ўдзел, з'яўляючыся адным з ініцыятараў Міжнароднай гуманістычнай школы, якая займаецца даследаваннем моўных з'яў на пагранічча.

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Трэцяя частка — найбольш цікавая для гісторыкаў і сацыёлагаў, гэта публікацыі з галіны грамадскай і палітычнай дзейнасці прафесар Смулковай, якая ў 1991-1995 гадах была консулам, а затым паслом РП у Мінску. Аўтарка прадстаўляе ў ёй праблемы тоеснасці і талерантнасці ў Беларусі, беларускасці і польскасці на пагранічча ў час глабалізацыі, звяртае ўвагу на моладзь, якая стаіць часта перад дылемай выбару прыналежнасці, акрэслення сваёй тоеснасці. У гэтай частцы знойдзем і больш асабістыя фрагменты, напрыклад, дзённік Яніны Баран, маці аўтаркі, са ссылкі ў Томск у 1941-1946 гадах.

Праца над кніжкай, як успамінала аўтарка, была вельмі складанай. „Сабранне пад адну вокладку, прачытанне ўся-

[працяг ☞ 2]

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Хлопцам-рыбалоўцам" – 20

Ганна Кандрацюк

Нядзеля перад Піліпавым постам. 24 лістапада. У Рыбалах у царкве ўжо адслужылі нядзельную багаслужбу. Сёння маліліся за гурт „Хлопцы-рыбалоўцы". 20-гадовы юбілей — справа важная. Ёсць момант задумы. Пра мінулае і пра будучыню.

— Чаго добрага можа цяпер спадзявацца чалавек у вёсцы? Адны хваробы, старасць, адзіноцтва. Нічога не хочацца. Хто можа ўцякае ў горад, — расказваюць мясцовыя.

У Рыбалах, як усюды. Хаця, не да канца... З „Хлопцамі-рыбалоўцамі" дзеецца нешта ненармальнае — з цягам часу яны, замест старэць, маладзеюць. Адзін Пётр Мартынюк, ветэран, дваццаць гадоў не сыходзіць са сцэны. Цяпер, разам з ім выступае ўжо сын.

Дзве справы на раз

— Бо ёсць у нас людзі з такой энергіяй, што то пажыць хочуць, — кажа мясцовая цётка, — паспяваць, патанцаваць. Між людзей паехаць, пабачыць як іншыя жывуць. Работы і так не пераробіш!

Цяперашні склад калектыву цяжка назваць „рыбалаўскім". Спяваюць хлопцы з усёй парафіі. З Беластока даязджае настаўнік і гарманіст Вітак Анафрыюк. Разам, сем чалавек — *вспанялых*, баявітых і расспяваных. Мастацкім кіраўніком тут энергічны Янка Бурнос, псаломшчык.

Калектыў заснавалі восенню 1982 года. Прыдумалі яго дзве жанчыны: Валянціна Ласкевіч (родам з Рыбалаў) і Лідзія Мартынюк.

— Прыехала да нас Валя і загадала, што тут мае быць калектыў. Два месяцы хадзіла Лідка Мартынюк ад хаты да хаты і намаўляла. Спачатку калектыў быў мешаны. Спявалі мужчыны і кабеты. Як пераапрануліся ў мундзіры пажарнікаў, то асталіся адны хлопцы. Кіраваў імі Пятро Нявінскі, — успамінаюць.

Першае выступленне і першы поспех прыйшлі ўжо ў 1983 годзе. Спадабаліся за тую баявітасць, за энергію ў голасе. Мундзір мабілізаваў: гурт рабіў дзве справы на раз — распальваў эмоцыі публікі і тушыў пажары ў наваколлі.

Добрыя запахі

— Нам, каб клуб адрамантаваць, а то людзей сорам запрасіць, — кажуць перад выступленнем хлопцы-рыбалоўцы. Якраз прыехала тэлебачанне, здымаць будуць.

Усярэдзіне святочная дэкарацыя, сцэну здобяць шары з надпісам „Фартуна". На насценгазетах дыпломы з конкурсаў, памятныя граматы для калектыву. Іх больш за пяцьдзесят.

— І то шчэ нэ всё, — кажа пані Лідка Мартынюк, кіраўнічка дома культуры, якую называюць *наша клюбова*. Разам з дыпломамі здымкі спевакоў. У Сопаце, у Славакіі, у Беларусі, на беларускіх фэстах...

Разам з паняй Лідзіяй завіхаюцца мясцовыя дзяўчаты ў беларускіх касцюмах.

— Добрыя запахі, — кідае хтось з парога. У клубе рыхтуюць запусты, апрача спеваў будзе гасціна і танцы. Гурт дыска-пола з Харошчы рэпетуе перад выступленнем — гучыць несмяротны гіт: „Ты ж мэнэ пудманула".

— Одён, то прэч до батька подуобны! — каментуюць за плячыма мясцовыя. Бо хоць яны з Харошчы, то таксама свае. Бацька двух музыкантаў родам з Рыбалаў.

У калідоры свой столік з касметыкай паставіла фірма „Avon".

[працяг ☞ 3]

Трэба брацца за работу... ☞ 3

У будучым годзе завершым будову дарогі Лушчы — Курашава. У наступным годзе плануем закончыць будову водаправодаў. Тады засталіся б толькі адзінкі, якія маглі б далучыцца да водаправоднай сеткі ў наступных гадах. Думаем таксама аб будове ачышчальні сцёкаў і каналізацыі ў Чыжах і навакольных вёсках.

Праўда пра герояў ☞ 4

Мяне найбольш уразіў некрытычны падыход гісторыкаў да апісання падзей пяцідзесятых гадоў. Групы з некалькіх чалавек, якія хаваліся ў мясцовых пушчах, называліся вучонымі падпольным войскам, якое змагалася за незалежнасць Польшчы. Ахвярамі іх шаленства не былі салдаты, міліцыянеры ці супрацоўнікі служб бяспекі, а звычайныя людзі, якія не хацелі аддаць кажуха, ботаў, сала ці самагонкі.

Місія ў Ішкалдзі ☞ 5

У Ішкалдзі, якая цяпер вёскай, на вуліцы не было жывой душы. Усё ж, мы былі шчаслівыя — інфармацыя Напалеона Роўбы была чыстай фантазіяй. Старажытны касцёл, пасля грунтоўнага рамонту, выглядае як новы. У гатычным франтоне адбівалася праменне сонца на зыходзе.

Юбілей „Антракта" ☞ 8

Тэатральны калектыў „Антракт" з Бельскага дома культуры, якім апякуецца Альжбета Фіёнік, 22 лістапада святкаваў пяцігоддзе свайго існавання. З нагоды юбілею яго ўдзельнікі выступілі з чатырма тэатральнымі прадстаўленнямі і дэкламацыямі вершаў.

Дзед ды баба... ☞ 9

Калісь харашэ было жыць, а цяпер то няма з кім і пагаварыць. Бывала, у Быстранскі лес у ягады хадзілі і спявалі, і з Белак спеў быў чутны. Калісь вечарам на вуліцы бабы спявалі, а цяпер усе то з кульбай, то з горбам. У царкву ходзяць яшчэ, спяваюць. А нядаўна брат брата нажом угадзіў, то *карэтка* прыязджала...

Памятная сустрэча ☞ 10

Вось і ў абітурыентаў 1977 года ўзнікла ахвота спаткацца толькі ў сваёй кампаніі... Годам пазней, 12 жніўня 2001 года, пасля 24 гадоў ад развітання са школай, сустрэліся ў Гайнаўцы амаль усе вучні былога класа „б". На камерную сустрэчу ў пабе „Ляснічанкі" згаданыя выпускнікі запрасілі толькі свайго выхавацеля Яна Сельвесюка.

Беларусь — беларусы

Выратавальны круг для беларускага прэзідэнта

Візіт А. Лукашэнкі ў Маскву, што адбыўся 27 лістапада, надаў не толькі больш канкрэтныя рысы ў беларуска-расійскіх дачыненнях, але ў многім праясніў развіццё палітычных працэсаў на Беларусі ў бліжэйшыя некалькі месяцаў.

Апошнія падзеі на знешнепалітычным напрамку сведчылі пра тое, што беларускаму кіраўніцтву ўвогуле цяжка жыць без якіхсьці скандалаў. Пачынаючы з лета гэтага года, калі Кансультатыўна-назіральная група АБСЕ была пазбаўлена магчымасці працаваць у самой Беларусі, жаданне з кімсьці сварыцца вылілася за межы краіны. Пасля заяў аб тым, што Беларусь не стане 90-м суб'ектам Расіі, пасля „газавага скандалу" і, нарэшце, пасля візавых праблем з Захадам сітуацыя ўсё больш станавілася заблытанай і толькі лянівы не рабіў прагнозы пра тое, як будуць развівацца падзеі далей. Аднак іх развіццё не аказалася чымсьці нечаканым і ўкладваецца ў разуменне той палітыкі, якую ўзяла на ўзбраенне пуцінская Расія.

Актыўны ўдзел усходняй суседкі Беларусі на міжнароднай палітычнай арэне прывёў да ўзмацнення пазіцый сённяшняга расійскага кіраўніка як у самой Расіі, так і за яе межамі. Больш таго, па напрамку, які вызначылі сабе за галоўны, а гэта барацьба з міжнародным тэрарызмам, вядучыя краіны свету, Расія дзейнічае амаль поруч са Злучанымі Штатамі Амерыкі. У свеце, здаецца, вядзецца сур'ёзны перадзел сфер уплываў, які мусіць скончыцца ўсталяваннем і ўзмацненнем двух палітычных полюсаў. Калі да першага, без сумнення, адносяцца ЗША, то на другі ўсё больш актыўна прэтэндуе Расія. Самае цікавае, што на дадзеным этапе і той, і другі бок зацікаўленыя ў мацаванні адзін другога. Таму мы і становімся сведкамі згоды па іракскай праблеме на карысць ЗША, „заплюшчвання вачэй" на парушэнні правоў чалавека ў Чачні і гэтак далей.

Да „гэтак далей" варта аднесці фактычную згоду на падпаданне пад поўную залежнасць ад Расіі Рэспублікі Беларусь. Расійскае кіраўніцтва цяжка абвінавачваць у тым, што яно абыякава аднеслася да „візавай" знявагі беларускага саюзніка, бо цяпер у апошняга не засталося ніякага поля для манеўраў на знешнепалітычным і, што самае галоўнае, знешнеэканамічным напрамку. І таму Расіі размаўляць з ім значна прасцей.

Менавіта пра згоду прымушае думаць забарона на ўезд у сваю краіну вышэйшаму кіраўніцтву Беларусі з боку Злучаных Штатаў. Гэтая забарона адбылася не адразу пасля прыняцця падобнага рашэння 14 дзяржавамі Еўропы, а амаль што на тыдзень пазней, пасля візіту ў Расію Джорджа Буша і агучанага ўсімі сродкамі масавай інфармацыі запрашэння ў Маскву А. Лукашэнкі. Зразумела, пытанне Беларусі не было галоўным на расійска-амерыканскай прэзідэнцкай сустрэчы, але тое што яно там было, сумнявацца цяжка.

Вынікам візіту беларускага лідэра стала ягоная заспакоенасць. Заспакоенасць, у першую чаргу, уласным лёсам. Заявы Пуціна, што „мы разглядаем Беларусь як незалежную дзяржаву, якая мае права самастойна вызначаць прынцыпы ўнутранай і знешняй палітыкі", сталі паказчыкам таго, што, па меншай меры, на дадзеным этапе Расію мала цікавяць праблемы парушэнняў правоў чалавека ў саюзнай краіне. Больш таго, увачавідку праявілася зацікаўленасць расійскага кіраўніцтва, а значыць і капіталу, у пашырэнні сваёй прысутнасці на Беларусі. І дабівацца гэтага пашырэння значна прасцей менавіта пры цяпер дзеючым беларускім прэзідэнце, амбіцыі якога на маскоўскія апартаменты ўдалося папярэдне прыглушыць.

Асмялеў і кіраўнік беларускай краіны. Ён шчыра прызнаўся, што яго ўжо не так хвалюе нежаданне мець з ім зносіны з боку заходніх прэзідэнтаў. Акрамя таго, А. Лукашэнка абвесціў аб сваім намеры пайсці на трэці прэзідэнцкі тэрмін. Пры тым, што беларуская Канстытуцыя гэта забараняе.

Такім чынам, па ўсім відаць, у бліжэйшы час у Беларусі варта чакаць прыходу расійскага капіталу, які, вобразна кажучы, накладзе лапу на ледзьве дыхаючыя беларускія дзяржаўныя прадпрыемствы, а палітычнае жыццё, пасля невялікага перапынку, зноў стане нагадваць стаячае аўтакратычнае балота.

Адзіным пытаннем, што засталося пасля маскоўскага візіту Лукашэнкі, гэта яго словы аб гатоўнасці весці перамовы з АБСЕ аб мандаце місіі ў Мінску. Магчыма яны сталі вынікам нейкага перавыхавання, а можа спробай захаваць магчымасць калі-небудзь аднавіць растрачаны палітычны аўтарытэт.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларусь і пагранічча

[1 ☞ працяг]

го, што чалавек напісаў на працягу доўгіх гадоў навуковай працы, — сказала Альжбета Смулкова, — як і падборка артыкулаў, якія могуць быць самымі цікавымі, было цяжкай працай. Працай, якая набыла форму кніжкі".

Пагранічча, якое з'яўляецца своеасаблівым феноменам культуры, у кніжцы прафесар Смулковай набывае новае значэнне. Усе прыпісваныя яму да гэтай пары адмоўныя якасці — адзінства і разнароднасць — становяцца тут козырам у барацьбе за талерантнасць да мінулага і будучыні.

Як сцвердзіў прафесар Яўген Мірановіч, кніжка *Białoruś i pogranicza* з'яўляецца эскізным у часавай перспектыве аўтапартрэтам аўтаркі. У кніжцы паказаны найважнейшыя праблемы беларусаў і палякаў на пагранічча, таму цікава яна будзе не толькі моваведам, гісторыкам ці сацыёлагам, але і ўсім, хто цікавіцца нацыянальнымі меншасцямі на пагранічча.

Паўліна Шафран

Панікаваць нельга, хаця падставы ёсць

Асноўным вынікам „круглага стала", які адбыўся ў Гродзенскім абласным грамадскім аб'яднанні „Ратуша", сталася тое, што яго ўдзельнікі выказалі шэраг прапаноў для вяртання беларускай мовы ў шырокі ўжытак. Дарэчы, тэма гучала так: „Стан беларускай мовы на Гродзеншчыне".

У цэлым па Беларусі колькасць беларускамоўных школ катастрафічна змяншаецца. У 1995 годзе было афіцыйна пераведзена 108 школ на рускую мову навучання, у тым ліку 91 вясковых. За апошнія шэсць гадоў закрыта 315 беларускіх школ.

Усяго ў Беларусі ў 2001 годзе было 1 498 417 школьнікаў. З іх у 1999/2000 навучальным годзе вучылася па-беларуску 463 371 школьнікаў (30%), па-руску — 1 081 798 (70%), па-польску — 874 (0,1%), па-літоўску — 76; а ў 2000/2001 адпаведна: па-беларуску — 435 012 (29%), па-руску — 1 062 424 (70,9%), па-польску — 903 (0,1%) і 78 па-літоўску.

У 1999/2000 навучальным годзе працавала 2847 школ з беларускай мовай (61,7%), з рускай — 1147 (24,8%), а з беларускай і рускай мовамі — 620 (13,4%). Год пазней згаданых школ было адпаведна: з беларускай — 2822 (61,9%), з рускай — 1201 (26,3%), а з беларускай і рускай мовамі — 533 (11,7%).

Дынаміка ўдзельнай вагі школьнікаў, якія вучыліся па-беларуску цягам апошніх 7 гадоў, на Гродзеншчыне такая: у 1994/95 навучальным годзе 50,7%, 1995/96 — 50,8%, 1996/97 — 51,3%, 1997/98 — 51,5%, 1998/99 — 51,0%, 1999/2000 — 50,3%, а ў 2000/01 — 48,3%.

Дынаміка прыёму для навучання на беларускай мове ў Гродзенскай вобласці (падрыхтоўчыя, першыя класы): у 1994/95 навучальным годзе 86,9%, 1995/96 — 61,4%, 1996/97 — 50,8%, 1997/98 — 44,1%, 1998/99 — 37,2%, 1999/2000 — 37,0%, а ў 2000/01 — 34,1%.

Можна адзначыць адносную стабільнасць на Гродзеншчыне. Гэта тлумачыцца тым, што тут вышэйшая нацыянальная свядомасць, глыбокія карані маюць традыцыі. Параўнайце, Мінск — 4,3%, Брэсцкая вобласць — 28,8%, Віцебская — 25,4%, Гомельская — 19,4%, Мінская — 34,1%, Магілёўская — 22,3%. Гэта даныя 2000/2001 навучальнага года.

Што да нібыта адноснай стабільнасці стану беларускай мовы на Гродзеншчыне, то трэба абавязкова ўдакладніць, што гэтае „дасягненне" базуецца на сельскіх дашкольных установах. У 2000 годзе іх было 277 (8,7 тысяч дзяцей). У той жа час дашкольных устаноў у гарадах налічвалася 236 (38,9 тысячы дзяцей). Назваць малакольнасныя сельскія школы беларускамоўнымі — адно. Але параўнанне лічбаў сведчыць пра катастрафічны стан беларускай мовы ў цэлым. Дадам, што ў 2000 годзе ў дашкольных установах вобласці выхоўвалася ўсяго 47,6 тысячы дзяцей. У гарадах дашкольнікаў беларускай мове амаль не вучаць. Так, напрыклад, у Гродне. Зразумела, што ў школе заганная практыка працягваецца, і беларуская мова паступова заглухне.

Вось дакладныя лічбы за 2001 год. Усяго беларускай мове на Гродзеншчыне вучылася 48,3% дзяцей (51,3% у 1999/2000 г.), у тым ліку ў горадзе 31,9%, на вёсцы — 90,4% дзяцей. Усяго на рускай мове навучалася 51,2% (горад — 67,5%, вёска — 9,5%).

Актывістка адраджэнчага руху Тамара Талерчык узгадвае, што ёй давялося ў свой час многа пахадзіць па кватэрах, угаворваючы бацькоў аддаваць сваіх дзяцей у беларускамоўныя класы. Нехта не пускаў у пакой, маўляў, рабіць вам няма чаго. Іншыя шчыра казалі, што гэта пустая справа, бо куды пойдзе выпускнік пасля заканчэння сярэдняй школы: вышэйшых навучальных устаноў у Беларусі няма. Яшчэ горш, калі пасля базавай школы гвалтоўна ажыццяўляецца пераход на рускую мову навучання. Праўда, многія бацькі перапісвалі свае заявы з просьбай, каб іх дзеці вучыліся па-беларуску. Вялікую агітацыю праводзяць самі настаўнікі, каб бацькі выбіралі навучанне сваіх дзетак абавязкова па-руску!

Прыкладаў такіх, сапраўды, шмат. Аднак нельга пагадзіцца, што такія факты паўсюдныя. У педагагічных калектывах нямала людзей, якія шануюць родную мову, па-ранейшаму вядуць работу па яе пашырэнні. Праўда і тое, што гэтыя асобы вымушаны працаваць з аглядкай, сваю настойлівасць і адданасць не афішыраваць, каб не прыцягнуць лішнюю ўвагу. Хто хоча мець непрыемнасці?

Антон Лабовіч

„Блудны сын" вяртаецца

Былы амбасадар Беларусі ў Японіі Пятро Краўчанка паведаміў, што 13 снежня плануе вярнуцца ў Мінск. Дыпламат не выключыў, што там супраць яго „могуць быць інспіраваны правакацыі палітычнага характару".

У інтэрв'ю ІТАР-ТАСС спадар Краўчанка яшчэ раз пацвердзіў, што не збіраўся прасіць палітычнага прытулку ў ЗША. Дыпламат паведаміў, што зараз завяршаюцца запланаваныя раней пратакольныя мерапрыемствы ў Японіі, неабходныя ў сувязі з ад'ездам.

На 26 снежня, паводле экс-амбасадара, была прызначана яго аўдыенцыя ў імператара Акіхіта. Аднак, „у сувязі з апошнімі абставінамі" спадар Краўчанка адмяніў яе і 13 снежня вылятае на радзіму.

Навіны Хартыі'97, 06.12.2002 г.

Паведамленне для прэсы

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь разгледзеў шэраг кадравых пытанняў. Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Латушку Паўла Паўлавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

Прэс-служба
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
„Звязда", 7.12.2002 г.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Мікалай Ігнацюк, Люба Гаўрылюк і Ала Каменская

„Хлопцам-рыбалоўцам” — 20

[1 ☞ працяг]

Каб Рыбалы не заснулі

У святліцы сабралася процьма народу. Прыйшлі рыбалаўскія, з суседніх вёсак, прыехалі з Беластока.

У першым радзе госці: віцэ-консул Рэспублікі Беларусь Ігар Сякрэта, Ян Сычэўскі і Валянціна Ласкевіч з ГП БГКТ, Леанарда Богдан з Дзяржаўнай добраахвотнай пажарнай стражы (з віншаваннямі ад старшыні Вальдэмара Паўляка і пажарніцкім шлемам), прадстаўнікі Ваяводскага аддзела культуры ў Беластоку, бурмістр Заблудава Міраслаў Ладны (з гітарай-падаркам), суседкі-спявачкі з Козлікаў і калектыў з Гарадка.

Разам і бацюшка Рыгор Сасна. У Рыбалах такі парадак, што святкаванняў у час посту не спраўляюць. Сам бацюшка намаўляе маладых спяваць у калектыве:

— Пакуль наш калектыў будзе спяваць, — кажа свяшчэннік, — Рыбалы не будуць спаць.

У трох касцюмах

Святкаванне пачалося з канцэрта. Выступілі ветэраны калектыву. Усе, „маладыя” і іх папярэднікі, гукнулі свой шэдэўр, песню „Хлопцы-рыбалоўцы”. Прыйшоў Мікалай Ігнацюк. І хаця ён пасля цяжкай аперацыі на ногі, усё ж з дапамогай кастыля ўвайшоў на сцэну. У свой час спадар Ігнацюк разбудзіў цікавасць да тутэйшых старых песень. Уся Беласточчына спявала рыбалаўскі напеў: „А ўжэ тая крынічэнька мохом заросла”. Сам пісаў песні для калектыву. Атрымаў многа віншаванняў, кветкі, каробку шакаладак ад Валянціны Ласкевіч.

Своеасаблівыя пажаданні выказала Ніна Цыванюк з Гарадка.

— Гляджу і завідую, што вы такія маладыя і харошыя. І каб заўсёды ўмелі жартаваць як калісь:

— *Што за біда такая?* — пажартаваў калісь на фэсце адзін рыбалаўскі спявак, — *дэ нэ повэрну нагавіцямі, жанчына родіт!*

Анекдот спадабаўся, людзі павесялелі.

Рыбалоўцы выступілі ў трох касцюмах: у класічным (белая кашуля, чорныя нагавіцы і камізэлька, боты „каўбойкі”), у народных кашулях з паяскамі і пажарніцкай святочнай форме.

Cała sala śpiewa

Бурмістр Заблудава Міраслаў Ладны пасля выбарчага поспеху таксама развесяліў публіку. Сыпануў анекдотамі, як на выбарчым мітынгу:

— Co jest przeciwieństwem bujania w obłokach?

— Страж пажарна! — крыкнуў хтось з залы.

— Nie! Przeciwieństwem bujania w obłokach jest przejście przez ulicę w Rybołach.

Або: — Co jest bardziej przegrane niż największy szlagier?

Ніхто не ведаў.

— Artysta w gabinecie sponsora.

Сам бурмістр падарыў калектыву гітару, а ўдзячныя „Хлопцы-рыбалоўцы” праспявалі яму: „A wszystko te czarne oczy”.

Калі ідзе пра спонсараў, мерапрыемства падтрымалі дробныя прадпрымальнікі. А да забавы, ужо ў час канцэрта горача намаўляў згаданы гурт з Харошчы: *Cała sala śpiewa, wszyscy się kołyszemy, bierzemy się pod rączki*. Весела, як на вяселлі, зрабілася...

Ганна Кандрацюк

Трэба брацца за работу...

Размова з новавыбраным войтам Чыжоўскай гміны Юрыем ВАСІЛЮКОМ, кандыдатам ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта.

— Перамаглі Вы ў выбарах з запасам галасоў. На што Вы звярталі ўвагу ў час выбарчай кампаніі?

— Арганізаванне кампаніі патрабавала многа часу і сіл. Я наладзіў многа непасрэдных спатканняў з выбаршчыкамі, якія далі ім магчымасць лепш пазнаёміцца з маёй асобай. Я даведаўся ў час сустрэч аб справах, якія турбуюць жыхароў Чыжоўскай гміны.

— Напэўна хочуць інвестыцый.

— Людзі хочуць паправіць стан дарог у гміне і чакаюць прыцягнення інвестараў для стварэння малой прамысловасці.

— У пятнаццацісабовай Радзе засядае восем радных ад БНВК. Ці будзеце шукаць падтрымку ў астатніх радных?

— У час першай сесіі я прапанаваў радным ад СЛД-УП супрацоўніцтва, якое было б у карысць усім жыхарам нашай гміны. Трэба брацца за работу і я думаю, што не будзе спробаў разбіваць Раду. Супольна засяродзімся на праблемах, якія трэба вырашыць у нашай гміне.

— Ці плануеце ўводзіць арганізацыйныя змены ў гміннай установе?

— Хачу рэарганізаваць працу ў гміннай установе, каб жыхары гміны адчувалі, што чыноўнікі дзейнічаюць для іх дабра. Аднак змены не будуць ісці ў напрамку ўвальненняў з працы без аглядак.

— На першай сесіі былі выбраны ўлады Рады. Хто заняў самыя важныя пасады?

— Старшынёю Рады стала Валянціна Якімюк з Падрэчанаў, а яе намеснікам Славамір Галёнка са Збуча, якія з'яўляюцца раднымі ад БНВК. Сакратаром засталася Марыя Ляшкевіч.

— Якія справы лічыце самымі важнымі ў гміне?

— Хочам асфальтаваць як найбольш дарог і закончыць будову будынка, у якім будзе знаходзіцца гмінная ўстанова. Зараз Чыжоўская гміна абапіраецца на сельскую гаспадарку. Разгарнуўся таксама невялікі гандаль. Плануем падатковымі льготамі прыцягнуць у гміну інвестараў, якія створаць прадпрыемствы і дадатковыя месцы працы.

— Можа ёсць ужо першыя прадпрымальнікі гатовыя дзейнічаць у гміне?

— Паявіліся першыя асобы ахвотныя рэалізаваць у нас інвестыцыі, але рана яшчэ гаварыць пра назвы прадпрыемстваў. Вядуцца размовы пра будову ў нас трансляцыйных аб'ектаў для патрэб радыёвяшчання і тэлебачання, за якія мы атрымлівалі б вялікія падаткі.

— Былі вы кандыдатам ад БНВК. Ці плануеце звярнуць асаблівую ўвагу на развіццё беларускай культуры ў гміне?

— Выдатная большасць жыхароў нашай гміны гэта беларусы. Будзем арганізаваць беларускія мерапрыемствы і ўдзельнічаць у іх. Лічым, што актыўнае навучанне беларускай мовы ў нашых школах будзе развівацца.

— Якія яшчэ інвестыцыі будуць рэалізаваны ў гміне?

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— У будучым годзе завершым будову дарогі Лушчы — Курашава. У нашай гміне многа павятовых гравійных дарог і будзем намагацца, каб павятовыя ўлады зацікавіліся іх асфальтаваннем. У наступным годзе плануем закончыць будову водаправодаў. Тады засталіся б толькі адзінкі, якія маглі б далучыцца да водаправоднай сеткі ў наступных гадах. Думаем таксама аб будове ачышчальні сцёкаў і каналізацыі ў Чыжах і навакольных вёсках. Будова разложана была б на некалькі этапаў. На гэтую інвестыцыю хочам браць сродкі з Нацыянальнага і Ваяводскага фондаў аховы асяроддзя і з уласнага бюджэту. У далейшай будучыні хацелі б збудаваць на прыгожай рэчцы Локніцы некалькі невялікіх рэтэнцыйных вадасховішчаў і арганізаваць у гміне агратурыстычную дзейнасць. Плануем будаваць пры Падставовай школе ў Чыжах гімнастычную залу, а ў хуткім часе спартыўную пляцоўку. Трэба таксама ўпарадкаваць справы звязаныя са звалкамі смецця.

— Адкуль плануеце браць сродкі на інвестыцыі?

— З уласнага бюджэту і еўрапейскіх фондаў. Ужо нават выступілі да фонду SAPARD за дафінансаванне завяршэння будовы водаправоднай сеткі. Будзем таксама браць крэдыты і пры меншых інвестыцыях разлічваць на спонсараў.

— Будова будынка для патрэб гміннай установы вядзецца ўжо многа гадоў. Як хочаце завяршыць гэтую інвестыцыю?

— Я нядаўна размаўляў з прадстаўнікамі Кааператыўнага банка, якія згодны часткова фінансаваць заканчэнне будовы гэтага будынка, каб перанесці туды сваё аддзяленне. Паколькі ў гэты будынак будзе пераведзена гмінная ўстанова, апошнія сродкі будзем выдаткоўваць з гміннага бюджэту.

— У Кленіках спынена будова вялікага асяродка здароўя. Якая яго будучыня?

— Цяпер асяродак здароўя знаходзіцца ў школьным будынку. Новы будынак вельмі вялікі і мы не зможам выкарыстаць яго на свае патрэбы. Будзем прадаваць яго і зараз рыхтуем прапанову для зацікаўленых яго купляй. Інвестараў запрашаем наведаць нашу гміну.

— Дзякую за размову

Гутарыў Аляксей Мароз

Не маглі дамовіцца

У час першай сесіі Рады горада Бельска-Падляшскага, якая адбылася 18 лістапада, радныя доўга не маглі выбраць старшыню Рады. Перад сесіяй „Бельская кааліцыя”, якую складаюць прадстаўнікі Беларускага выбарчага камітэта і Саюза ўкраінцаў Падляшша, не змагла дамовіцца з камітэтам СЛД-УП. На сесіі ажно пяць разоў радныя выбіралі старшыню Рады. У першых двух галасаваннях „Бельская кааліцыя” прапанавала Пятра Кандрацюка (атрымаў 7 і 8 галасоў), а Самаўрадавая правая „Еднасць” выставіла свайго кандыдата Яна Радкевіча (атрымаў па 7 галасоў). Радныя ад СЛД-УП найчасцей галасавалі супраць прапанаваных кандыдатаў або іх галасы былі няважнымі. У час трэцяга галасавання СЛД-УП прадставіла свайго кандыдата на старшыню — Яна Панасюка і тады галасы раздзяліліся паводле трох камітэтаў. Нават доўгі перапынак і размовы паміж раднымі не далі станоўчых рэзультатаў у чацвёртым галасаванні. Толькі за пятым разам Пётр Кандрацюк быў абраны старшынёю рады (галасавалі на яго 11 асоб). Намеснікі старшыні былі выбраны ў першым галасаванні. Сталі імі Яўген Сіманюк з СЛД-УП і Рамуальд Марганскі з Самаўрадавай „Еднасці”. У час выступлення перад раднымі нававыбраны бурмістр Яўген Беразавец заявіў, што будзе працягваць інвестыцыі — будову крытага басейна і мадэрнізацыю ачышчальні сцёкаў.

Размовы прадстаўнікоў „Бельскай кааліцыі” з бурмістрам пасля сесіі таксама не вырашылі аб супрацоўніцтве з СЛД-УП у Радзе.

Аляксей Мароз

Выканаўчая ўлада Гайнаўскага павета

На другой сесіі Рады Гайнаўскага павета, якая адбылася 27 лістапада, прыняты быў статут працы Рады і выбраны былі выканаўчыя ўлады павета. Намеснікам старасты стаў Ежы Сірак, які атрымаў падтрымку 14 радных у 17-асабовай радзе. Ва ўправу ўвайшлі Мікола Аляксюк, за якога прагаласавалі 14 радных, Ян Савіч, якога падтрымала 10 асоб і Яўген Валкавыцкі, за якім прагаласавала 9 радных. Радныя вырашылі, што будуць маглі ўзнікаць клубы, якія завяжуць прынамсі 3 радных і столькі ж радных змогуць прадстаўляць на сесіі праекты пастаноў. Клуба радных не будуць маглі завязаць 2 радных ад правых груповак. Аднак будуць яны маглі працаваць у камісіях. (ам-з)

Праўда пра герояў

Ад больш дзесяці гадоў не выпадае ўжо інакш пісаць пра салдатаў пасляваеннага падполля як аб „змагарах за свабоду і дэмакратыю, патрыётах, героях" і так далей у такім жа стылі. Гісторыкі, палітыкі і публіцысты заяўляюць пры тым, што цяпер толькі могуць пісаць самую чыстую праўду, у адрозненне ад пэнэраўскага перыяду, калі цэнзура прымушала няшчасных інтэлектуалаў называць іх „рэакцыйным элементам" ці звычайна „бандытамі". Асабліва гратэскава новая тэрміналогія гучыць, калі былых членаў Нацыянальных узброеных сіл ці Нацыянальнага вайсковага саюза называюць героямі былыя апаратчыкі камуністычнай партыі ці польскага камсамола — Саюза сацыялістычнай моладзі.

Месяц таму канферэнцыю прысвечаную антыкамуністычнаму падполлю на Беласточчыне арганізаваў мясцовы аддзел Інстытута нацыянальнай памяці. Канферэнцыя праходзіла ў лірычным настроі, вучоныя вярталі памяці, як гаварылася, забытых нацыянальных герояў. Трохі папсаваў атмасферу беларускі кантэкст гэтай праблемы, аб чым, дарэчы, паінфармавалі мясцовыя сродкі масавай інфармацыі. Нават цяпер беларусы, прыпамінаючы Зані, Залешаны, Шпакі, Патоку і іншыя мясцовасці, учынілі прафанацыю паніхіды, што адбывалася ў гонар пасляваеннага падполля.

Мяне аднак падчас гэтай канферэнцыі найбольш уразіў некрытычны падыход польскіх гісторыкаў да апісання падзей пяцідзесятых гадоў у Сувальскім ці Аўгустаўскім паветах, дзе не было беларусаў. Групы з некалькіх чалавек, якія хаваліся ў мясцовых пушчах, называліся вучонымі падпольным войскам, якое змагалася за незалежнасць Польшчы. Гадзінамі расказвалі яны як выглядала тое змаганне. Аднаго дня забілі солтыса, другога — партыйнага дзеяча, трэцяга — падазронага ў супрацоўніцтве з уладамі. Дзесяткі чалавек забітых без ніякага сэнсу толькі таму, што пару вясковых хлопцаў захацела гуляць у вайну. Ахвярамі іх шаленства ў той час не былі салдаты, міліцыянеры ці супрацоўнікі служб бяспекі, а найчасцей звычайныя людзі, якія перажылі вайну і акупацыю, а загінулі таму, што не хацелі аддаць „змагарам за свабоду" кажуха, ботаў, сала ці самагонкі.

Гісторыкі апісалі амаль кожны дзень дзейнасці членаў гэтых узброеных груп. Кожную іх ахвяру прадстаўлялі як ворага Польшчы. Толькі адзін, які паказаў сітуацыю ў сваёй вёсцы, што ў гміне Ліпск заўважыў, што пару забітых магло быць вынікам прыватнай вайны, якая цягнулася ад трыццатых гадоў. Камандзір групы звычайна пазбыўся суседзяў, з якімі яго сям'я сварылася за мяжу. Але гэта быў інцыдэнт падчас канферэнцыі, які зараз палагодзіла вучоная з беластоцкага ІПН, якая і гэтыя ахвяры палічыла канфідэнтамі бяспекі.

Найбольш у падыходзе да тэмы падполля здзіўляе тое, што ніхто з сучасных даследчыкаў нават не прабуе пытацца мясцовае грамадства як запамяталіся яму людзі, якія пяць гадоў пасля вайны бегалі па вёсках з аўтаматамі, прымушалі плаціць сабе падаткі, аддаваць маёмасць, інфармаваць пра суседзяў, а за кантакты з уладамі пагражалі расстрэлам. Дзяржаўны апарат са свайго боку таксама не аставаўся абыякавым у выпадку супрацоўніцтва з „падпольным войскам". Але вучоных зусім не цікавіць лёс пераважнай большасці грамадства, якое хацела толькі бяспечна жыць.

Слухаючы некаторых дакладчыкаў я пачаў нават задумоўвацца, калі вядомых з сучаснай крымінальнай хронікі грамадзян Прушкава ці Валаміна пачнуць прадстаўляць як змагароў за свабоду эканамічнай дзейнасці, за ліберальны падыход да фінансаў і заканадаўства. Магчыма, што за 50 ці 70 гадоў школам у Польшчы стануць прысвойваць імя „Першынга", ці „Дзяда". Ніколі невядома, якіх герояў будзе патрабаваць вялікая палітыка. Вядома толькі, што заўсёды будуць вучоныя гатовыя даказаць самы высокі ўзровень маральнасці найбольш кашмарных асобеняў.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Перамагай сілу сілай

Мабыць, з прычыны невясёлых асабістых перажыванняў, у апошні час заўважаю мноства агрэсіі, хамства і бязглуздасці. Прычым амаль усюды: ад вуліцы па тэлебачанне. Да шалу даводзіць мяне нейкі Куба Ваявудзкі, вядучы ў адной з камерцыйных тэлестанцый уласны *talk show* і, што горш, ацэньваючы моладзь таленавітую музычна ў праграме „Idol". Да тае ступені, што ў апошні час, калі даходзіць да ацэнкі выступаючых, мяняю пультам канал. Не магу зразумець яго нахабства, бесцырымоннай назойлівасці, мяжуючай амаль з недахопам элементарнай прыстойнасці ў адносінах да іншых. Прычым Ваявудзкі фарсіць так на вачах шмат мільёнаў тэлегледачоў, а затым кіраўніцтва мусіць гэта адабраць. А як не акцэптаваць, калі паводзіны Кубы выклікаюць радасць, а нават энтузіязм маладой публікі-тэлегледачоў, чаму дае яна выраз у інтэрнэтавых дыскусіях.

Шэфства тэлестанцыі, мабыць, так сабе думае: вось, даем вам, маладым, тое, чаго вы шукалі. Гэтым самым распаўсюджваюць, часам фармуюць, а іншым разам дазваляюць на ўзор, згодна з якім робяцца моднымі няшчаднасць, неўшанаванне іншых і іх уражлівасці, пасля згодна з тымі ўзорамі дазволены ў грамадскім жыцці будзе кожны прыём, уключна з насіллем, гвалтам. І, што самае дзіўнае, журналісцкае асяроддзе, якое павінна пільна сачыць за этыкай масмедыяў, маўчыць. Бо быў бы гэта замах на незалежнасць медыяў. Што застаецца? На маю думку: байкот аўтара праслаўленых „попісаў", праграмы, урэшце, тэлестанцыі, якая распаўсюджвае такі стыль. На практыцы гэта, аднак, нічога не значыць, а для сённяшніх камерцыялізаваных медыяў, а і для шмат якіх публічных асоб, няважна, што гаворыцца, абы толькі гаварылася. Для прыкладу, у апошніх парламенцкіх і самаўрадавых выбарах выйграў на гэтым Анджэй Лепэр са сваёй камандай.

Ёсць яшчэ іншая форма байкоту, якая ў падобных выпадках прымае форму г.зв. змовы маўчання, значыць, у журналісцкім свеце, і ўвогуле публічнай дзейнасці — нефармальна падпісацца пад заявай: „Ты кончаны, нідзе не знойдзеш сабе месца". Але як не даць месца такім Ваявудзкім, калі папраўляюць яны „oglądalność", наганяюць касу. І так ракавое кола замыкаецца. Толькі рукі апусціць. Да таго яшчэ афірмуюць стыль Ваявудзкага і ацэньваючыя разам удзельнікаў „Idola", от, хоць бы Роберт Ляшчынскі, музычны рэдактар ствараючай грамадскую думку, высокатыражнай у Польшчы „Gazety Wyborczej", які, як здаецца, зайздросціць Ваявудзкаму тае „забойнасці".

Аднойчы я, якраз пасля таго, як паглядзеў паўтор „Idola", рушыў у горад аўтобусам. З цяжкасцю працінуўся ў салон цераз стаячых у дзвярах пасажыраў. Ніхто не зрабіў і жэсту, каб прапусціць уваходзячых хоць на два крокі назад, дзе было шмат месца. Едучы, пачуў дыялог двух гімназістаў:

— Ведаеш, пад будай пабілі Марэчка.

— Нашы?

— Не, якіхсьці трох, як паліў *dragi*, і вырвалі яму касу.

— А-а-а, а ці гэта мяне я...

Даязджаў я ўжо на „свой" прыпынак. Не паспеў паставіць нагу на першую прыступку ўсходкаў, калі тры самавітыя кабеціны зараз жа пасля таго, як расчыніліся дзверы, рушылі да штурму. Нічога не дало: „Дазвольце, калі ласка, выйсці!" Задзейнічаў я па прынцыпу: „Так іграеш, наколькі дазваляе супернік". Не ведаю толькі, чаму ў мяне мелася ўражанне, што тое маё аўтобуснае падарожжа ўпісалася ў клімат і стыль прапанаваны Кубам Ваявудзкім. А, можа, наадварот?

Мацей Халадоўскі

Апазіцыя на прыцэле

(працяг; пачатак у 49 нумары)

Незалежнае і дэмакратычнае Згуртаванне беларускіх афіцэраў

Калі на адной з нарадаў у прэзідэнта Лукашэнкі міністр унутраных спраў Юры Захаранка сказаў, што не будзе выконваць загады, паводле якіх трэба забіваць людзей, ён апынуўся ў ролі экс-міністра. Захаранка далучыўся да апазіцыі і стварыў незалежнае, дэмакратычнае Згуртаванне беларускіх афіцэраў, якое павінна было стаць альтэрнатывай падобнай пралукашэнкаўскай і прарасійскай арганізацыі. Я некалькі разоў спатыкаўся са спадаром Захаранкам і, як афіцэр запасу, вырашыў уступіць у яго арганізацыю.

Ствараючы арганізацыю, якую рэжым лічыў часткай сілавой апазіцыі, Захаранка рабіўся ўсё больш небяспечным для афіцыйных уладаў. Ён падпісаў уласны прысуд, не ўсведамляючы гэтага. 7 мая 1999 года па дарозе дамоў ён знік. Дзеячы беларускай апазіцыі на падставе вядомых ім фактаў сцвярджаюць, што Захаранка быў забіты паводле замовы ўладаў. Сям'я не вытрымала ўціску і знайшла палітычны прытулак у Германіі.

Часовы ўрад

Я быў знаёмы з Віктарам Ганчаром яшчэ калі ён быў віцэ-прэм'ерам ва ўрадзе Чыгіра і мы разам удзельнічалі ў рабоце Каардынацыйнага савета па справах нацменшасцей пры Савеце Міністраў. Ён нядоўга быў на сваёй пасадзе, бо не падзяляў поглядаў Лукашэнкі наконт таго, як трэба кіраваць краінай. Хутка Ганчар падаў у адстаўку і перайшоў на бок апазіцыі. Падчас наладжвання кантактаў з Варшавай ён неаднойчы звяртаўся да мяне за дапамогай.

Увечары, 16 верасня 1999 года, Віктар Ганчар знік разам з бізнесменам Красоўскім. Апазіцыя назвала гэты выпадак чарговай атакай на тых, хто змагаецца з рэжымам. Віктар Ганчар быў тады старшынём Вярхоўнага Савета 13-га склікання. Ён рыхтаваў чарговае пасяджэнне парламента, на якім збіраўся прачытаць даклад пра негатыўныя наступствы палітыкі прэзідэнта Лукашэнкі і стварыць Часовы ўрад.

Падзяка за незалежнасць

У 1991 годзе былы старшыня беларускага парламента Станіслаў Шушкевіч разам з Барысам Ельцыным (Расія) і Леанідам Краўчуком (Украіна), рызыкуючы жыццём, дакументальна засведчыў распад СССР. Дзякуючы гэтаму, Беларусь здолела стаць незалежнай, а былы старшыня калгаса Аляксандр Лукашэнка — яе прэзідэнтам. Здавалася б, за такія заслугі С. Шушкевіча павінны былі шанаваць як народнага героя. Але нявольнікам такія героі непатрэбны. Прэзідэнт і яго паслугачы ацанілі подзвіг Шушкевіча ў 1,5 долара — такога памеру пенсію ён зараз атрымлівае. Улады спадзяюцца, што без сродкаў да існавання Шушкевічу будзе не да змагання з рэжымам.

Усе мы з радасцю перажывалі нараджэнне незалежнай беларускай дзяржавы. Калі ў 1992 годзе старшыня парламента С. Шушкевіч прымаў дэлегацыю Саюза палякаў Беларусі, якую я ўзначальваў, мы пачалі размаўляць папольску. Падчас размовы Шушкевіч раптам заўважыў, што не ўсе прысутныя разумеюць польскую мову, і прапанаваў паклікаць перакладчыка. Мы вырашылі выправіць памылку, таму другая частка размовы прайшла на беларускай мове, хоць тады яна яшчэ не мела статуса дзяржаўнай.

Такім чынам, дзякуючы ўзаемнай падтрымцы, адраджалася беларуская дзяржаўнасць і мова, а таксама і польскасць у Беларусі.

Ён не здаўся

Сямён Шарэцкі з 1995 года выконваў функцыі старшыні беларускага парламента 13-га склікання. У 1996 г. разам з групай беларускіх дэпутатаў ён ініцыяваў імпічмент прэзідэнту Лукашэнку. Іх падтрымала дастатковая колькасць дэпутатаў, падпісаўшы адпаведную прапанову. Гэта павінна было адбыцца. Але былому старшыні Канстытуцыйнага Суда стала вядома, што ў адносінах да яго былі сабраны кампраметацыйныя матэрыялы, якія трапілі на стол прэзідэнту. Старшыню падкупілі, гэтак жа як і частку дэпутатаў, якія згадзіліся адклікаць свае подпісы ў абмен на пасады і прывілеі. Так сённяшні лёс Беларусі вызначыла група маральна дэградаваных людзей.

Я быў тады ў Шарэцкага дарадчыкам па справах нацменшасцей і часта суправаджаў яго ў розных дэлегацыях, у тым ліку і падчас візітаў у Польшчу. Я бачыў, як адносіны Шарэцкага ў адносінах да Польшчы рабіліся ўсё больш прыязнымі. Ён неаднойчы дапамагаў беларускім палякам адстойваць іх правы.

Ці рабіў Шарэцкі памылкі? Напэўна. Яго часта абвінавачваюць у тым, што ён не здолеў давесці імпічмент да заканчэння, што даверыўся дэлегацыі Расійскай дзяржаўнай Думы, якая прыехала ў Беларусь у якасці пасрэдніка ў вырашэнні канфлікту, а насамрэч дапамагла Лукашэнку захаваць уладу.

Я сачыў за дзейнасцю гэтага палітыка, пакуль яго не вымусілі пакінуць Беларусь. Ці можна апраўдаць яго ад'езд? Я лічу, што яму сапраўды пагражала небяспека. Шарэцкі і яго сям'я з'яўляюцца палітычнымі ўцекачамі. Зараз яны жывуць у ЗША.

(заканчэнне будзе)

Тадэвуш Гавін

Місія ў Ішкалдзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У гісторыі Беларусі здараюцца цуды. Вось, сто гадоў назад, касцёл у Ішкалдзі ўжо „не існаваў".

Напалеон Роўба пісаў:

Ішкалдзь. Мястэчка і маёнтак у Навагрудскім павеце, Мінскай губерні, 20 вёрст ад Міра і мілю ад Паланэчкі. Калісьці існаваў тут старажытны касцёл, на руінах паганскага капішча ўзведзены. Даўняя маёмасць Ілінічаў як частка Мірскага графства, пасля ў руках Радзівілаў і Вітгенштэйнаў. Маёмасць распродана разам з іншымі.

Сёння касцёл, які не толькі існуе і дзейнічае, як выдатны прыклад готыкі, мае быць, як і Мірскі замак, заведзены ў спісак помнікаў ЮНЕСКА.

* * *

Па дарозе ў Ішкалдзь мы падабралі ў „Ambulans" мясцовую прыгажуню. Дзяўчына пацвердзіла нашы думкі — касцёл быў і ёсць, адкуль яна памятае. Ішкалдзянка больш не адазвалася словам, хаця хлопцы стараліся як маглі:

— Ці мы такія страшныя? — гадалі пасля яны. Найбольш прэтэнзій было — вядома — да адзінага кавалера ды паэта, Юрася.

— Я ж не донжуан які! — бараніўся як леў Юрась.

У Ішкалдзі на вуліцы не было жывой душы. Усё ж, мы былі шчаслівыя — інфармацыя Напалеона Роўбы была чыстай фантазіяй. Старажытны касцёл, пасля грунтоўнага рамонту, выглядае як новы. У гатычным франтоне адбівалася праменне сонца на зыходзе.

Роўба, як лёгка здагадацца, не даехаў у Ішкалдзь.

* * *

Не дзіва — мінула сто гадоў, і зноў трэба мець многа шчасця, каб дабрацца ў Ішкалдзь. У наваколлі няма ні інфармацыйнай табліцы, ні ўказальніка. Мы трапілі сюды выпадкова... Заўзята шукалі дарогу ў Мядзведку і Паланэчку.

Касцёл у пачатку вёскі, на ўзгорку. За агароджай відаць раку Ушу.

У Ішкалдзі чатырыста душ. Ксёндз Мацей Шмыткоўскі, ад якога ззяе арэол аўтарытэта, расказвае пра сваю місію. У Пяткевічах і Малешах яшчэ семсот будзе. На парафіі ўжо 6 гадоў. На яго плечы лёг рамонт і аднаўленне касцёла.

— Дзяржава не дала ні адной капейкі, — кажа, — усе кошты панеслі прыхаджане.

— To są prawdziwi Polacy, — ксёндз сам родам з Коніна і цешыцца, што ўрэшце можа пагаварыць на польскай мове. Палякі з Ішкалдзі гавораць „нячыстай" беларушчынай. Сам ксёндз беларускай не ведае, ды і, здаецца, не мае намеру вучыцца:

— Język białoruski w czystej formie nie występuje, — кажа. — To taka mieszanina polskiego i rosyjskiego. Zresztą, ludzie chcą modlić się po polsku. Jedna parafianka powiedziała, że kiedy jest msza po polsku, to dusza jej oddycha.

У гісторыі сваёй місіі ў Ішкалдзі толькі раз вернік дамагаўся, каб маліцца па-беларуску. „To proszę mi powiedzieć «Ojcze nasz» po białorusku", — патрабаваў тады ксёндз і дзядзька замоўк, як вады ў рот набраўшы.

* * *

Памыляецца той, хто лічыць жыхароў Беларусі рахманым, лагодным народам.

— Moi parafianie są waleczni, — ксёндз Мацей расказвае пра гераічнае здарэнне ў сталінскія часы. Улады задумалі ўзарваць касцёл. Пад касцёл пад'ехалі бульдозеры. Тады ўсе ведалі — за супраціў чакала ссылка ў Сібір.

У Ішкалдзі прыдумалі спосаб. Людзі дамовіліся, што баставаць будуць жанчыны. І, вось, калі пад'ехалі ўжо машыны разбурваць касцёл, выступіла кабета.

— Па маім трупе! — сказала і легла разам з дзіцяткам пад колы бульдозера. За ёю пайшлі іншыя маладзіцы. Мужчыны тым часам стаялі побач і чакалі. Пасля... бульдозеры ад'ехалі. Касцёл ацалеў.

— Odwilż nastąpiła za Breżniewa, — расказвае ксёндз Шмыткоўскі.

Зноў задзейнічалі ішкалдзянкі. Паводле мясцовай легенды, яны паслалі пажаданні на імяніны жонкі Брэжнева. Пасля атрымалі з Масквы дазвол на багаслужбы.

Падобную гісторыю, два гады назад, мы чулі ў Опсе.

* * *

Ішкалдзкі касцёл, як лёс Беларусі, пераходзіў з рук у рукі. Мяняў інтэр'ер, сімволіку. Пабудаваны перад 1472 годам у стылі готыкі. У другой палове XVI ст. касцёл перайшоў да кальвіністаў, у 1641 г. быў Радзівіламі вернуты каталікам. За Радзівілаў сярэдзіна храма была распісана фрэскамі.

У час вайны 1654-60 гг. пашкоджаны. Адноўлены і вернуты для набажэнстваў. У 1868-1919 гадах дзейнічаў як праваслаўная царква (гэта ў час, калі пра Ішкалдзь пісаў Напалеон Роўба). За II Рэчы Паспалітай храм зноў дзейнічаў як касцёл.

Сучасны інтэр'ер у народным стылі. З арыгінальнага астаўся адзін балкон для арганаў. Вітраж праектаваў сам ксёндз Шмыткоўскі.

— Як хтось прыедзе і пабачыць, — адзначае святар, — то не разумее, колькі чалавек намагаўся. За кожнай дробяззю трэба было хадзіць па начальніках — ад сельсавета да міністэрства.

— Будучыня? — ксёндз думае ўголас. — Цяжка сказаць, у парафіі ўсё менш людзей. Адзіная тут школа ў Пяткевічах працуе на рускай мове.

* * *

У Паланэчку, хаця адсюль адна *міля*, мы не паехалі. Вечарэла, а нам трэба было падумаць пра начлег. Кіроўца, злосны як шэршань, патрабаваў вяртацца ў Мінск.

— Сколькі жыву, не відзел такіх чудакоў! — паўтараў. На слова „Мядзведка" — як кажуць палякі — *w jego kieszeni otwierał się nóż.*

Пра Паланэчку мы баяліся ўспамянуць.

Ганна Кандрацюк

*Napoleon Rouba — *Przewodnik po Litwie i Białejrusi*, Wilno 1909 — Gdańsk 1995

Фота ВЯЧАСЛАВА ХАРУЖАГА

Шанц на поспех

З пачаткам новага навучальнага года ў чаромхаўскай Гімназіі пачалі навуку 184 вучні. Школа карыстаецца шасцю лекцыйнымі заламі, у тым ліку, камп'ютэрнай. Не хапае гімнастычнай залы. Заняткі па фізкультуры адбываюцца ў Пачатковай школе разам з вучнямі шостых класаў.

Педагагічную кадру састаўляюць двух атэставаных настаўнікаў, дзевяць — назначаных, чатырох кантрактных і стажор. Дзесяцерых лічацца штатнымі працаўнікамі Гімназіі. Адзін даязджае з Кляшчэляў. Божаму Закону навучаюць трох катэхетаў — двух праваслаўных і адзін каталіцкі.

У Гімназіі арганізавалі футбольную секцыю дзяўчат, якую вядзе Тамаш Шатыловіч. У павятовых спаборніцтвах (у лістападзе г.г.) каманда заваявала другое месца і атрымала пераходны кубак. Апрача таго ў школе працуе секцыя настольнага тэніса. Каманда Эдуарда Мазурка ў складзе: Кацярына Мазурэк — I „б" клас, Марта Ліпінская і Агнешка Скуза — II „б" клас, заваявала другое месца ў павятовых спаборніцтвах і атрымала сярэбраны медаль. Хлапечая каманда ў саставе: Ігар Блышчук — I „б" клас, Лукаш Світальскі — III „б", Дарак Каравай — II „а" і Яцак Кэснер — III „б", у гэтай жа дысцыпліне спорту заваявала залаты медаль.

— З выхаванцамі няма праблемаў. Паводзяць сябе акуратна, — гаворыць дырэктар Ежы Шыкула. — Не прыкмячаем схільнасці да наркотыкаў ці алкаголю. Часам здараецца нейкаму хлопцу папяросу закурыць, але не робім з гэтага праблемы. Па маёй думцы, — працягвае дырэктар, — гэта вынік належнага зацікаўлення з боку бацькоў сваімі дзецьмі, чым яны займаюцца ў вольны час. Праблемы вучняў і школы рашаем з Радай бацькоў. Суадносіны з Кураторыяй асветы таксама адпаведныя. Не здарылася, каб назначаных Гімназіі датацый не атрымалі. Настаўнікі чаромхаўскай Гімназіі гэта амбітныя людзі, не сядзяць склаўшы рукі. Іх цікавіць грамадскасць і будучыня маладога пакалення. Рашылі яны ўключыцца ў паток грамадска-палітычных перамен напярэдадні ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз.

— Аб'яву прыкмеціў у Інтэрнэце, — гаворыць Ежы Шыкула. — Зацікавіла прапанова Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі аб фінансавай дапамозе на павышэнне і змену прафесійных кваліфікацый жыхароў вёсак на тэрыторыі вясковых і гарадска-вясковых гмін у 2002 годзе. Прапанова настолькі была цікавай, што мы прад'явілі свае паслугі Агенцтву ўзамен за камп'ютэрнае абсталяванне залы на суму 15 тысяч злотых.

— У чым заключаюцца Вашы паслугі?

— Прапануем арганізаваць камп'ютэрнае абучэнне I і II ступені. Пакарысталіся б ім земляробы і вясковыя гаспадыні. Мяркуем арганізаваць чатыры групы па дваццаць слухачоў. Мэта абучэння — умеласць карыстацца камп'ютэрам на практыцы. У абучэнні II ступені слухачы навучыліся б выкарыстоўваць камп'ютэрную тэхніку ў прафесіі земляроба пры дапамозе Інтэрнэта. Дакладней кажучы, Інтэрнэт быў бы крыніцай інфармацый для земляроба і заадно ведаў наконт інтэграцыі з Еўрасаюзам. — Па маёй думцы, — канстатуе дырэктар Шыкула, — гэта шанц для жыхароў гміны, паколькі навучанне іх нічога не каштавала б. Жыхары пашырылі б веды, што зараз вельмі важна напярэдадні ўваходу ў Еўрасаюз.

Размаўляў Уладзімір Сідарук

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Настаўніца чытае першакласнікам „Зорку”

Ветлівы I „а” клас

У дзень нашай сустрэчы Юлітка Нікалаюк святкавала дзень нараджэння.

— Запрашу сваіх сяброў у Фікаланд.

Гуляць разам з Юліткай збіраюцца ўсе сябры з беларускай групы. У класе сем асоб ходзіць на ўрокі беларускай мовы, а Юлітцы сем гадоў.

— *Нам сем гадоў, і ўсе мы вясёлыя...* — заспявалі хорам дзеткі.

Быў таксама вершык пра восень, пра мыш у смятане, пра ветлівыя словы.

Сапраўды, дзеці ў I „а” класе Пачатковай школы н-р 4 у Беластоку ветлівыя. Яны памяталі не толькі пра дзень нараджэння сваёй сяброўкі. Разам святкавала і іх настаўніца беларускай мовы спадарыня Аліна Ваўранюк.

— Сёння рыхтуемся да свята „Развітанне з восенню”. Дзеці — запросім „Зорку? — папытала настаўніца.

— Та-а-а-ак! — хорам адказалі першакласнікі.

Яны арыгіналы — між сабой гавораць па-беларуску. Нават Міхася, якая раней не вучылася беларускай мове, стараецца. Большасць дзяцей — выхаванкі беларускага садка.

9 снежня вучні I „а” класа паказалі спектакль „Дзедава рукавічанька”. Выступілі як лялечны тэатр. Запрасілі бацькоў, сяброў.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Юлітка Нікалаюк святкавала дзень нараджэння

У час прэзентацыі „Нівы” дзеці прыкмецілі рысунак, надрукаваны разам з артыкулам „Сапраўдны сцяг”. Настаўніца прачытала словы песні.

— Я ведаю гэту песню! — усклікнула Юлітка Нікалаюк.

— Ведаеш? — усе здзівіліся. Бо ў прадшколлі гэтай песні не вучыліся.

— Ведаю! Навучыла мяне мама.

І дзяўчынка заспявала „Люблю наш край, старонку гэту”. Мы былі прыемна здзіўлены, бо Юлітка праспявала многа строф.

На канец дзеці расказалі пра сябе. Пра сваіх брацікаў, сястрычак і зацікаўленні:

— а ў мяне бітлівы брацік,

— а ў мяне вясёлы сабачка,

— а ў мяне сястрычка... што мае нарадзіцца!

Усіх развесяліў Ігар Карнілюк, у якога, ёсць сястрычка, сабачка, калекцыя кактусаў і нават калекцыя шэршаняў!

Зорка

Мая мясцовасць Орля

У маёй мясцовасці ёсць гміна. Нядаўна адбыліся выбары войта, якім стаў Ян Добаш. У Орлі ёсць стары млын. У млыне мелецца збожжа на муку. Ёсць таксама царква, у ёй служаць два бацюшкі: Аляксандр Такарэўскі і Анатоль Такаюк. Ёсць яшчэ Гмінны асяродак культуры, у якім мы вучымся танцаваць і спяваць па-беларуску.

Наталля Такаюк,
IV „б” кл. ПШ у Орлі

Вершы Віктара Шведа

З даху спаўзла драбіна

Матуля плач пачула сына,
Знямеў ён, ледзь азваўся з жаху:
— Мама, ты паглядзі, драбіна
Спаўзла перад хвілінай з даху.

— Не плач, ты ж тут не вінаваты,
Бацьку сказаць аб тым павінен.
— Дык ведае аб гэтым тата,
На сцекавой вісіць ён рыне.

Гісторыя была карацейшай

— Хіба дрэнна вас сёння вучаць,
Або ты толькі гультай горкі.
Калі я вучыўся, унучак,
Па гісторыі меў толькі пяцёркі.

— Прадмет гэты складаны на рэдкасць,
З кожным годам стаецца цяжэйшым.
Калі ты вучыўся, мой дзедка,
Была гісторыя нашмат карацейшай.

Дзённік Міколы

Зачараваная Аня

Мы ляцелі Андралексам і любаваліся прыгажосцю краявідаў. Краіна Гот — гэта свет, які прыдумаў і намаляваў Нор Узі. Я і мае сябры былі ў захапленні.

— Ух! — махнуў рукой Нор Узі. — У Краіне Рот — яшчэ прыгажэй. Бо, ведаеце... Краіну Гот я прыдумаў, калі быў у вашым узросце..

— Цікава, — перабіў Тамаш, — мне здавалася, што тут...

— Што, што такое, Тамаш? — запытаўся Нор Узі.

— Што тут найпрыгажэй, як толькі можа быць! — паправіўся Тамаш.

— Глядзіце! — закрычала Аня. — Глядзіце. Там напісана КАНЕЦ!

— Так, так, — сказаў мастак, — і гэта значыць адно: канец з фантастыкай.

— Як гэта разумець? — запытаўся Ярак. — Ці гэта значыць, што хутка даб'емся да мэты?

— Так, — чарговы раз сказаў Нор Узі, — праз момант перасячэм мяжу краіны Рот.

— Як тут цудоўна! — усклікнуў я. — Як тут многа зелені.

— Выходзьце, — сказаў Нор Узі і адчыніў дзверы Андралекса.

Мы выскачылі з машыны і пачалі цешыцца прыгажосцю. Зразу кожны з нас пачаў рабіць нешта іншае. Я бегаў па зялёным квяцістым лузе, Ярак прысеў пад дрэвам у роздуме, Нор Узі пачаў маляваць чарговую карціну, а Аня хадзіла туды-сюды і гутарыла са сваім „хлус-кантам”. Я падышоў да яе і запытаўся:

— Чаму размаўляеш з прадметам?

— Чаму пытаеш?

— Бо гэта дзіўная справа. Цікавая...

— Больш будзе цікава, калі ты перастанеш ілгаць, — абурылася Аня. Я нічога не адказаў і пайшоў да Ярка.

— Як думаеш, чаму Аня не бачыць свету за гэтым „хлус-кантам”? — спытаўся я ў сябры.

— Не ведаю, але здаецца мне, што апошнім часам яна змянілася.

— Так, гэта праўда, яна цяпер іншая! — пацвердзіў нашы назіранні таксама і Томак.

— Можа, яе зачаравалі?

Мы змоўклі, бо адчулі тут моц.

(працяг будзе)

(нак-с)

Мышка

Завялася мышка на шостым паверсе ў „хмарачосе" ў Беластоку па вуліцы Вясёлай. Ці не дзіўна? Ці мышка не зможа жыць у шматпавярховым будынку, калі людзі могуць — у такіх клетках з бетону? Людзі на высокія паверхі на ліфце падымаюцца. А як мышка? Забегла? А чаму мышак, канкрэтных мышак, людзі не любяць? У мульціках мышак, такіх як Мікі Маўс, кахаюць, у коміксах — прападаюць за іх прыгодамі, а хай толькі паселіцца мышка ў іх доме ці ў гаспадарцы — ганяюць, ставяць мышалоўкі, напускаюць на іх катоў... Бо ж адна мыш колькі шкоды ў гаспадарцы наробіць! Адна! А калі ў яе заводзіца шмат-шматдзетная сям'я, і ў адзін год тая мышка і маці, і бабка, і прабабка... А ўсё мышынае сямейства раты разяўляе, есці хоча! Дык цягне мышка ў норку зерне за зернейкам, моркву за морквай... А і запас шкоды не робіць. А ў блёку? Дзе тут норку зробіш, як і на чым разжывешся!..

Ходзіць мышка начамі па хаце, мышкуе. Спаць не дае Анютцы, яе маме Люсі, тату Колю, а найбольш бабулі Зосі. Бабуля папраўдзе ўжо прабабка Анютцы прыходзіцца, яна — баба мамы Люсі, з вёскі прыехала. Кажа, што старая, а старым не спіцца ноччу.

— З кім ты ноччу размаўляла? — спыталася ў бабкі Анютка. — Сама з сабою?

— З мышкай размаўляла.

— А яна ўмее па-нашаму? Ці ты, бабулька, па-мышынаму ўмееш?

— Мышыную мову я ведала, як малой была.

— Так? А, можа, і я ноччу пра штосьці ў мышкі спытаюся! Калі выйдзе, разбудзіш мяне, добра?

— Бабця, не дурыце вы галаву малой! — строга паглядзеў на прабабку тата. — Лепш пастаўце мышалоўку.

— Яна сама пойдзе, Коля. Ведаеш, якую вестку прыносіць мышка ў дом? Што прыб'ецца да нас хтосьці.

— Госць? — пацікавілася Анютка.

— Дзіцятка!

— Ой, гэта ўжо занадта! Гэтак пры Анютцы, бабця!

Тут засмяялася мама:

— Мышка мае рацыю!

І праўда, мышка прадказала, што ў Анюткі будзе брацік. Міхаська. А мышка, як прыйшла, так і пайшла. У той дзень, як рассакрэцілі яе місію. Мабыць, у суседні дом па вуліцы Вясёлай... Або і далей.

Міра Лукша

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Экскурсію вядзе спадар Дулько

Знаёміліся з пушчай

28 лістапада г.г. вучні з усіх класаў Пачатковай школы ў Арэшкаве разам з настаўнікамі ездзілі ў Белавежу, дзе наведалі запаведнік зуброў, музей і царкву.

— Мэтай экскурсіі, адобранай бацькамі на сходзе, было лепшае знаёмства з Белавежскай пушчай і яе насельнікамі ды засваенне станоўчых паводзін у грамадскіх месцах, — сказала настаўніца Лідзія Панькоўская, ініцыятарка і загадчыца экскурсіі.

У 9 гадзін аўтобус з дзяцьмі быў ужо перад запаведнікам зуброў. Пра пражываючых там звяроў вельмі цікава расказваў на беларускай мове ляснік, спадар Дулько. Многія дзеці ўпершыню пабачылі пушчанскіх звяроў і знаёміліся з імі. У час гадзіннага абыходу запаведніка дзеці найдаўжэй спыняліся каля загарад з ваўкамі, зубрамі і дзікамі.

Зубр з'яўляецца наймагутнейшай жывёлай Белавежскай пушчы і ўсёй Еўропы. Дзве тысячы гадоў таму ён пражываў на амаль усёй тэрыторыі нашага мацерыка (апрача Скандынавіі) ў двух разнавіднасцях: горскі (каўказскі) і большы — нізінны (белавежскі). Да пачатку XX стагоддзя зубры ў дзікім стане захаваліся толькі ў Белавежскай пушчы.

Дзеці даведаліся таксама, што ў 1916 годзе ў пушчы пражывала 736 зуброў, аднак у час першай сусветнай вайны нямецкія ваякі і браканьеры звялі іх дашчэнту; апошнія зубры былі забіты ў пачатку 1919 года. У цэлым свеце ў 1924 годзе налічваліся толькі 54 зубры. Першых зуброў прывезена ў нашу пушчу восенню 1929 года. Цяпер у заходняй частцы пушчы пражывае іх 348 штук на свабодзе і 30 у запаведніках. Апрача Белавежскай пушчы зубры жывуць таксама м.інш. у Кнышынскай пушчы (19-20 штук) і ў Барэцкай (амаль 80). У свеце жыве каля 4 тысяч зуброў, найбольш у Расіі, Беларусі, Украіне, Літве і Грузіі.

Вучні з Арэшкава пабачылі, што ў запаведніку, у загарадах, звяры не баяцца людзей. У той дзень статак дзікоў бегаў каля самай сеткі. Большасць гэтых дзікоў прывезена ў Белавежу з Беларусі, а ўзамен у Беларусь паехалі конікі тарпаны. Зубры паводзілі сябе вельмі спакойна. Казуля, калі яе выклікалі па імю (у запаведніку кожны звер мае сваё імя), падыходзіла да лесніка. Толькі воўк Фёдар, які ў запаведніку ад 4 чэрвеня 2001 года, нечым хваляваўся і бегаў па сваёй загарадзе.

(працяг будзе)

Міхал Мінцэвіч

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Беларусь і Напалеон

Дзень нараджэння імператара

У Віцебску французскі імператар рыхтаваўся да свайго дня нараджэння. Ён быў у гуморы. Нягледзячы на цяжкія страты, ягоныя войскі прайшлі ад Нёмана сотні вёрстаў і набылі яму пяць мільёнаў новых падданых.

У беларускіх гарадах вывешвалі партрэты французскага імператара. Газеты пісалі пра добраахвотнікаў, што запісваюцца ў Вялікую армію, і пра ахвяраванні на яе патрэбы. Князёўна Радзівіл ахвяравала дзесяць валоў і дванаццаць бараноў, а нейкі небагаты шляхціч з-пад Наваградка — рэшата яек і некалькі фунтаў масла. Такіх прыкладаў было шмат.

На пачатку вайны зычліва сустракалі напалеонаўскіх жаўнераў і беларускія сяляне. Яны марылі атрымаць свабоду ад прыгону, а таму дапамагалі французам, паказвалі ім дарогу, разам нападалі на маёнткі верных цару памешчыкаў.

Гэтым часам у напалеонаўскім войску служылі прыкладна 25 тысяч беларусаў.

Вядома, што ў свой першы віцебскі дзень Напалеон адшпіліў шпагу, кінуў яе на завалены вайсковымі картамі стол і абвясціў: „У гэтым горадзе я спынюся, злучу карпусы маёй арміі, дам ёй адпачынак і займуся ўладкаваннем гэтай краіны. Паход 1812 года — закончаны!"

Хто ведае, што сталася б, каб французскі імператар сапраўды спыніўся? Аднак неўзабаве ён перадумаў і тамсама, у Віцебску, пастанавіў ісці на Маскву.

Хоць прамінула ўсяго паўтара месяца вайны, прыхільнікі Напалеона ў нашай краіне адзначалі яго дзень нараджэння ўжо зусім не так радасна, як віталі пачатак паходу.

(працяг будзе)

Паўліна Нічыпарук

Чатыры

Магічнай лічбай ёсць чатыры
Бо для мяне яна злучаецца
З чатырма сценамі
Якія прыпамінаюць хату
А хата гэта месца сямейнага цяпла

Параўнанне

Гады маладосці
— усё прыгожае
усё што мы створым у сваім марах
Гады старасці
— усё губіць свае колеры
А нам так хочацца жыць.

Польска-беларуская крыжаванка № 50

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 46: Градка, ар, ер, дні, лаза, дзённік, зіма, цана, Ева, Данія, Ада. Дзед, дзіва, Дзвіна, анеліца, рака, грамада.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Івона Карповіч** з Гарадка, **Ілона Асіпюк** з Бельска-Падляшскага, **Альжбета Антанюк** і **Магдаліна Галёнка** з Арэшкава, **Паўля Вітальеў** з Орлі, **Юстына Асіпюк** з Нарвы, **Лукаш Габрылеўскі** з Новага Корніна. Віншуем!

Sum	▼	Bób / Granica	Chórzysta	Chłód	▼	Gazeta / Raj	Pragnienie	Juta	▼	X
▶		▼	Rzeka	▼ ▶		▼		▼		Tur
Brzoza ▶			▼				Mat / Wieloryb	▶		▼
Plakat	Fujarka ▶						▼		Ar	
▶	▼					Igor	▶		▼	
Imię chińskie		Adapter ▶								X

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пастаноўка „Вяселля" з удзелам Альжбеты Фіёнік (першая злева)

Юбілей „Антракту"

Тэатральны калектыў „Антракт" з Бельскага дома культуры, якім апякуецца Альжбета Фіёнік, 22 лістапада ў рамках XXII Бельскіх мастацкіх кліматаў святкаваў пяцігоддзе свайго існавання. З нагоды юбілею яго ўдзельнікі выступілі з чатырма тэатральнымі прадстаўленнямі і дэкламацыямі вершаў. Малодшыя вучні паказалі дзве тэатральныя сцэнкі „Яма дракона" і „Прывітанне вясны", з якімі раней выступалі перад бельскай публікай. Сярод дзетак многа добрых акцёраў. Вялі яны сябе свабодна на сцэне і патрапілі зацікавіць дзяцей і дарослых. Самай лепшай ігрой вылучаліся Юльяна Дораш, Ганна Паўлючук, Кацярына Бабулевіч і Кшыштаф Шчужэўскі. Падрыхтавалі яны багатую сцэнаграфію з дапамогай Альжбеты Фіёнік.

Старэйшыя вучні прадставілі абрадныя сцэнкі „Хрысціны" і „Вяселле". З гэтымі пастаноўкамі выступалі яны на абрадавых і тэатральных аглядах. У Ваяводскім аглядзе вясковых і абрадавых тэатраў у Ломжы за пастаноўку „Вяселле" атрымалі першае месца, а ў Тэатральным конкурсе ў Кляшчэлях занялі трэцяе месца. Выступалі яшчэ на Аглядзе абрадавых калектываў у Гарадку, Спасаўскіх запустах у Бельску, у бельскай „тройцы" і Бельскім доме культуры. Каб падрыхтаваць народныя абрады, моладзь сабрала фальклорны матэрыял у навакольных вёсках і апрацавала яго. Сярод старэйшых вучняў найлепшымі акцёрамі аказаліся Юльяна Шчурак, Агнешка Смактуновіч і Кацярына Казак, а вельмі прыгожа спявала Мальвіна Бароўская. У калектыве „Антракт" найбольш займаецца вучняў з Падставовай школы і Гімназіі н-р 3 ды Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ў Бельску. Сярод заснавальнікаў тэатральнага калектыву былі сённяшнія вучні чацвёртых класаў ліцэя Жанэта Роля і Мажэна Жменька, якія вялі юбілейны канцэрт. На мерапрыемства прыйшлі Міхась Сцепанюк і Тамаш Суліма, якія таксама выступалі раней у калектыве.

— Удзельнікі „Антракту" ўмеюць гаварыць на гутарковай беларускай мове. Многія цікавяцца мінуўшчынай і адкрываюць пры гэтым сваю беларускасць, — заявіла апякун Альжбета Фіёнік.

Пасля выступленняў найлепшыя акцёры атрымалі дыпломы, а святкаванне закончылася пачастункам.

Аляксей МАРОЗ

Атлас біялагічнай інвазіі

Выйшаў чарговы атлас Белавежскай геабатанічнай станцыі Варшаўскага універсітэта. На гэты раз прысвечаны ён інвазіі іншаземных дрэвавых прышэльцаў (Atlas obcych gatunków drzewiastych Puszczy Białowieskiej). Праца ахоплівае ўсю Пушчу і з'яўляецца вынікам творчага супрацоўніцтва польскіх і беларускіх даследчыкаў памянёнай станцыі і Дзяржаўнага нацыянальнага парку „Белавежская пушча" ў Камянюках.

База даных налічвае 9 451 запіс. Зыходзячы з характару атласа, аўтары даюць інфармацыю і аб прылягаючых да Пушчы населеных пунктах — іх каля 150, найстарэйшыя ўтварыліся ў XVI ст. У глыбіні Пушчы знаходзіцца 31 населены пункт. Даследчыкі выявілі 278 чужакоў, большасць якіх свядома ўвёў у культуру чалавек. Спантанна расце 105 ненашаў.

З'ява акліматызацыі іншаземных дрэвавых відаў набывае масавы характар і з кожным годам ахоплівае ўсё больш асобін. Даследчыкаў суцяшае факт большага павелічэння іх у культуры, чым у спантанна ўтвораных папуляцыях.

Атлас выдадзены на трох мовах: англійскай, польскай і беларускай. Аўтарамі з'яўляюцца: з польскага боку Войцех Адамоўскі, з беларускага — Людміла Дворак і Ігар Раманюк.

Г. В.

„Пагоня за праўдай" у Мінску

Польскі дакументальны фільм Юрыя Каліны „Пагоня за праўдай" 5 снежня змаглі ўбачыць беларускія журналісты і пісьменьнікі. У офісе беларускага ПЭН-цэнтра яго прэзентавалі сабраным самі аўтары — здымачная група першага канала Польскага тэлебачання.

Фільм прысвечаны сітуацыі са свабодай слова на Беларусі. Зрабіўшы стрыжнем сцэнарыя судовы працэс над журналістамі „Пагоні", аўтары фільма стараюцца даць гледачу агульнае ўяўленне пра ўмовы, у якіх даводзіцца працаваць недзяржаўным медыям Беларусі.

„Пагоня за праўдай" была прызнаная лепшым творам года ў галіне электронных медыяў сярод краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

www.racja.pl, 9.12.2002 г.

Адам Мастак — толькі дробязь, цень свайго маленькага пёрка. Ён сам хапае цень таго ценю, ажыўляе сваё *alter ego*...

Абматаны ў інтэнсіўны аранж... Скажы мне, кім ты ёсць

Так, вось, Адам Сяменчык прапануе вам свой сінтэз супярэчнасцей уласных я, праз пасрэдніцтва мастацтва і паэзіі, тых сястрыц соннае мроі, неабмежаванай свабоды, дадзенай кожнаму артысту... вядома, ім самім!.. — стараецца сказаць пра гарадоцкага мастака-паэта, аўтара польска-французскай кнігі* рэдактарка і перакладчыца Марта Цывінская, *паэтычны амбасадар* квартальніка *„Art et Poe´sie de Touraine"*, выразна захопленая не толькі творчасцю аўтара, як і яго індывідуальнасцю. „Хто ў наш час, шмат гадоў пасля афіцыйнай заявы пра смерць сюррэалістычнага руху, асмеліўся б рушыць у невядомае, адначасова захоўваючы прытым вялікую адвагу ў стваранні нават найбольш адлеглых асацыяцый, выснаваных з нутра карціны і сплётаў (павучынай сеці) паэмы..."

Ва ўступе, які налічвае слоў больш чым усе „вершаграмы" Адама Сяменчыка, які можна назваць эсэ, поўным асацыяцый з сусветнай літаратуры (Ралан, Топар, Арабал, Юрсэнар, Апалінэр, Эліядэ, Сартр, Ле Клезіо) і мастацтва (Мадыльяні...), называе яго Чарадзеем, „несвядомым сваёй спадчыны па Мэрліне, мастаком з французска-польскай душой, які дрэйфуе паміж сімволікай культуры Захаду і вібруючымі цудоўнасцю найбольш дзікімі крэсамі Усходняй Еўропы"...

Абсурдныя абліччы герояў карцін (ушытая ў зборнік мастацкая ўкладка), загубленых у касмічнай прасторы, самотныя ў сваім яркім колеры, якія быццам разбіваюць раму карціны і ўцягваюць гледача ў размову з тварам-маскай... Твары, можа пакутлівыя, а, можа, схаваныя за маскай, бяспечныя ў сваім выражэнні? А, можа, прывіды шэрае гадзіны, злоўленыя ў форму, часам быццам прымітыўнымі мазкамі пэндзля... Ды не, не маўчаць. Пры кожным твары — свой маніфест у словах. А, можа, усё гэта, як зазначае Марта Цывінская, толькі прыём у адносінах да гледача-чытача, „злоўленага ў сетку надінтэрпрэтаванага постмадэрнізму"?

з вымяшання колераў
узнікае клейкая мазь
паміж
мной і табой
табой і мной
калі спалучацца каляровыя постаці
можа ўзнікнуць шэрая сцяна
дэструктыўная спроба сынергіі
трэба тады выйсці
па-за рамы.

Кнігу выдала Студыя астрапсіхалогіі, якая мела дачыненне таксама да зборнікаў Барыса Руско. Выдавецтва мае назву *Instytut Wydawniczy Kreator*. Мабыць, па-за сваёй статутнай дзейнасцю, займаецца таксама прамоцыяй тутэйшых творцаў. Толькі душы ім акрэслівае па-нетутэйшаму?

З Адамам Сяменчыкам можна пазнаёміцца і электронна: www.siemienczyk.pl

Міра Лукша

*Adam Siemieńczyk, *powiedz mi kim jesteś*, bez miejsca wydania, 2002, ss. 103.

Дэкламатарскі конкурс

Oto już nadchodzi wrzesień,
Który żegna lata skwar,
Niesie nam złocista jesień
Swój bogaty nowy dar.

Wiktor Szwed

Дня 8 лістапада 2002 года ў святліцы Комплексу інтэграваных школ н-р 1 у Беластоку адбыўся дэкламатарскі конкурс пад загалоўкам „Popatrz ile jesieni". Дзеці з класаў інтэграванага навучання прапанавалі сабранай у святліцы публіцы вершы, у якіх восень іскрылася феерыяй колераў. Як жа прыемна было паслухаць у гэты дзень аб цудоўнай, нязвыклай асенняй прыродзе, відах выкліканых багаццем ігры святла і колераў. Калі за вокнамі цярушыў першы сняжок, у нас у святліцы свяціла асенняе, цёплае сонца.

У конкурсным журы прыняў удзел прыяцель нашых святліцовых дзяцей паэт Віктар Швед. У мінулым годзе гасцілі мы яго ў сябе падчас аўтарскай сустрэчы, вершы якога надта падабаюцца нашым падапечным. Таму і падчас конкурсных змаганняў было многа дзяцей, якія выбралі вершы Віктара Шведа са зборніка *Lata wiatr skrzydlaty*: „Późna jesień", „Złota jesień", „Dary jesieni", „Babie lato", „Brzoza", якія дэкламавалі Анна Зайка, Іаанна Патэюк, Аляксандра Парафінюк і Енджэй Чарвінскі. Гэтыя вучні атрымалі ад Віктара Шведа спецыяльныя ўзнагароды — кніжкі з яго паэзіяй, а ў першую чаргу з аўтографамі — што мела асаблівае значэнне для нашых дзяцей.

Паэзія — гэта штосьці асабліва далікатнае, крохкае, нематэрыяльнае, гэта прыгажосць акаляючага нас свету, якая знаходзіцца ў некалькіх словах, сказах, страфах. Дзякуючы такім конкурсам дзеці вучацца спасцерагаць пачуцці і перажыванні іншых, уласціва рэагаваць на сум і радасць, развіваць у іх пачуццё тоеснасці. І гэта так сярод дэкламатараў, як і сярод слухачоў. Выбіраючы адпаведную тэматыку сустрэч ствараем у дзяцей такія рысы асабовасці як: уражлівасць на прыгажосць прыроды і яе колеры, гармонію колераў, феерыю колераў розных пор года. Гэты дзень быў асаблівы таму, што сярод нас знаходзіўся паэт, які піша вершы такім менавіта дзецям.

Арганізатары конкурсу: Веслава Смалькоўская і Галіна Цыльвік дзякуюць Віктару Шведу за цеплыню і чароўнасць, якімі ён абдароўвае нашых падапечных, за тое што ён ёсць з намі.

Веслава Смалькоўская,
Галіна Цыльвік

Дзед ды баба, дзед ды баба

Гэтак найперш ахарактарызавалі сваю вёску — Сасіны — ейныя гаспадары, солтыс з жонкай, Мікалай і Валянціна Нікалаюкі. Даведаўшыся, што я з „Нівы" з гонарам заявілі, што іхнія ўнукі вучацца ў бельскіх беларускіх школах. Яны, пажылыя ўжо людзі, з'яўляюцца наймалодшымі гаспадарамі ў сваёй вёсцы. А так, то такія там гаспадары, што на бацькоўскай рэнце жывуць. У Сасінах пяцёрка дзяцей, даязджаюць яны ў боцькаўскую школу.

За вёскай, у бок Сабятына, відаць сляды колішніх паселішч. Валуны з правага боку з'яўляюцца рэшткамі даўняга панскага двара; у Сасінах быў вялікі маёнтак. У першую сусветную вайну двор згарэў і пан перабраўся ў Быстрае, дзе да таго часу быў адно фальварак. А ў чарговую вайну пан уцёк і ягоны маёнтак падзялілі між людзей.

З левага боку захаваўся толькі склеп. Жыў там Шымчук, які быў у Амерыцы, і за заробленыя там грошы купіў у Снежках маёнтак, які распасціраўся аж пад Сабятына. Ён пры санацыі першую жняярку купіў, з крыламі. Пасля Шымчуковы дзеці прадалі ўсё і ягоныя ўнукі нават туды не заглядаюць; бо і няма чаго.

З другога боку, ад Белкаў, таксама вялікая гаспадарка была. Яе купіў солтысаў дзед, таксама за заробленыя ў Амерыцы грошы. Дзед выехаў у Амерыку і там добра абжыўся, але давялося вярнуцца. Ён у Амерыцы ажаніўся з дзяўчынай з Галіцыі; яе маці прадала сваю зямлю, каб дачку выправіць у лепшы свет. Аднак амерыканскі клімат шкодзіў яе здароўю, і таму солтысавы дзед з бабай прыехалі ў Снежкі. Іхнія трое дзяцей вярнуліся на пакінутае ў ЗША дабро, а двое, дачка і сын — солтысаў бацька, які нарадзіўся за акіянам — асталіся ў Сасінах.

Назва вёскі, як мне сказалі, выводзіцца ад пана Саса, які калісь там жыў. Каля царквы калісь была крыніца з гаючаю вадою; у старой царкве стаяла многа кастылёў, якія пакінулі аздараўленцы. Аднак нейкая пані была ў той крыніцы выкупала сабаку і тая крыніца прапала.

Няма ўжо ў Сасінах і старой, Праабражэнскай, царквы. Калі ў 1947 годзе людзі вярнуліся ў хаты з велікоднага набажэнства, царкву ахапіў пажар. Адна жанчына, каталічка, успела выцягнуць з агню Галгофу; уратавалі яшчэ і адну харугву. А іншая жанчына стаяла з боку і смяялася. І тады з полымя вырвала праз акно палаючую кніжку, якая ўпала на страху ейнай клуні, якая згарэла запар з царквою.

Новую царкву пачалі будаваць восенню 1951 года, пад зіму накрылі. Будавалі польскія майстры з-за Буга, ад Сарнакаў; людзі іх у сябе па чарзе кармілі і начавалі. Іканастас зрабіў майстар з Бельска. Цэглу для царквы рабілі ўсе, а найбольшы ўклад працы ўнёс Іван Леўчук. Цэглы нарабілі столькі, што яшчэ хапіла на агароджу могілак у Мілейчычах.

Да 1895 года пакойнікаў хавалі побач царквы. Яшчэ захаваліся каменныя стэлы з таго часу. Ахвяравалі іх Пракофій і Марыя, Сямён і Анастасія, Давід і Марфа... Цяжка ўжо чытаецца высечаныя ручным шрыфтам надпісы. Выдатна захаваўся затое крыж на пастаменце з чырвонага каменя, пастаўлены сто гадоў назад, з надпісам: „ЗА УПОК. ГОС. ДУШ УСОП. ПЕТРЯ АНАСТАСІИ ЛУКИ И ВСЕХЪ СРОД. СЕЙ КРЕСТЪ СООРУЖЕНЪ ПАВЛОМ АНАСТАСІЮ АЛЬШТЫНЮК 12 ОКТ 1902 Г."

Сёння пакойнікаў хаваюць за вёскай; кожная вёска мае свае могілкі. Да Сасінскага прыхода належаць яшчэ Белкі, Быстрае, Снежкі і Сабятына. У Снежках набажэнствы адпраўляюцца дзве нядзелі, а ў трэцюю нядзелю — у Сабятыне, дзе ёсць свая *каплочка*. У гэтым годзе ў Сасінах завершана пабудову плябаніі, цяпер у вёсцы дзве плябаніі і абедзве пустыя. Настаяцель жыве ў Бельску, а гэта прыхаджанам не падабаецца:

— *Паніско*! За ўсім званіць па яго трэба, а ён тут патрэбны амаль штодзень.

Ёсць яшчэ і іншы аспект наконт бацюшкі. Ашарашыла мяне пытанне:

— А вы не ведаеце: жыве ён з жонкай?

Ну так: бацюшка ў вёсцы можа адыгрываць асаблівую культавую ролю, так, як у шырокім свеце напр. Памэла Андэрсан. Людзі хочуць ведаць як найбольш пра свайго куміра, у тым ліку і ягоную *love story*...

— Калісь харашэ было жыць, а цяпер то няма з кім і пагаварыць. Бывала, у Быстранскі лес у ягады хадзілі і спявалі, і з Белак спеў быў чутны. Калісь вечарам на вуліцы бабы спявалі, а цяпер усе то з кульбай, то з горбам. У царкву ходзяць яшчэ, спяваюць. А нядаўна брат брата нажом угадзіў, то *карэтка* прыязджала...

Крамы ў Сасінах няма, самаходы штодзень ездзяць. Водаправода няма; войт абяцае на лета. Нядаўна, ужо восенню, тэлефоны правялі.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вяселле

Ну, і якая ж дзяўчына ў студэнцкім узросце не марыць пра сваё вяселле, тым больш, што хлопец ужо ёсць, а да таго каханы, свой...

Аня Артэмюк з Бельска-Падляшскага (чытачы „Нівы" мелі нагоду пазнаёміцца з яе карэспандэнцыямі) і Марк Верамюк з Дубіноў, што каля Гайнаўкі, сустрэліся на філалагічным факультэце Беластоцкага універсітэта. Ад'ехалі ад хаты, але ў сэрцах іх засталіся і родная мова, і родныя песні, і праваслаўная вера.

Калі ў мінулым годзе Аня з Маркам сустракалі праваслаўны Новы год у беластоцкім рэстаране „Амадэо", Аня ўжо тады вырашыла: вяселле будзе толькі тут! І толькі з гэтым аркестрам! Якраз іграў музычны калектыў „Master dance" Андрэя Каролькі, і родныя, беларускія песні ў выкананні гэтых музыкантаў заваражылі Аню. А Марка — мо яшчэ больш.

Як вырашылі, так і зрабілі. Вясною заказалі вяселле: найбліжэйшы тэрмін — 20 кастрычніка, сказалі ўладальнікі Фёдар і Ірэна Фідзюкевіч. Можа быць! — згадзіліся маладыя і пачалі рыхтавацца. Праўда, быў дробны клопат: у кастрычніку ж студэнты вучацца, дык вясельнае падарожжа ў Парыж Аня і Марк адбылі гэтым летам, яшчэ перад шлюбам.

Фота ВІТАЛЬДА ЛЕЎЧУКА

Маладыя спявалі народныя песні

Шлюб адбыўся 20 кастрычніка ў саборы святога Мікалая ў Беластоку. Вясельныя госці запоўнілі ледзь не ўсю царкву. Што ні кажы, было іх амаль дзвесце чалавек.

А пасля ўсе сустрэліся ў „Амадэо". Усе, што прыехалі з Бельска, Гайнаўкі і іх ваколіц, а нават з Вроцлава. Але беластачан было, бадай, найбольш, а перш за ўсё студэнцкая моладзь.

У прыгожай, прасторнай зале былі танцы, песні, розныя вясельныя гульні. Не абышлося таксама без „перапівання" і „ачапінаў". Толькі Ані старшая дружка зняла вэлюм, толькі нацэлілася маладая, каб кінуць яго, „не гледзячы" назад, сваёй лепшай сяброўцы, ужо і аркестр перастаў іграць, а тут — адкуль ні вазьміся! — падляцела шасцігадовая сваячка Марка з Вроцлава, як віхор закруцілася і ледзь не вырвала з рук сяброўкі вэлюм, які ўжо плаўна ляцеў у вызначаным Аняй напрамку. Гэтая малая далёка зойдзе! — усміхаліся людзі.

Спадар Фёдар Фідзюкевіч паходзіць з Сакольшчыны, а яго жонка Ірэна — з Трывежы. Умеюць яны для сваіх гасцей стварыць адпаведны клімат. Гаспадар з'яўляецца тут адначасова і кухарам, ды не ябы-якім! Калі торт — дык пяціпавярховы, калі печаны парсюк — дык у акулярах і ўвезены на століку пад гукі аркестра. Усё прадумана тут і ва ўсё ўкладзена сэрца. Mit dem Herz! — як кажуць немцы.

Калі хтосьці захацеў бы слухаць тут нейкія іншыя мелодыі ці песні, напрыклад, італьянскія ці амерыканскія, аркестр „Master dance" можа зайграць па заказу. Але найбольш цёпла гаспадары прымаюць тут землякоў і найахвотней слухаюць з імі родныя песні.

Аня і Марк (цяпер ужо Верамюкі) канчаюць універсітэт у гэтым навучальным годзе. Пажадаем жа ім многа светлых хвілін і сатысфакцыі ў працы і ў сямейным жыцці.

Ада Чачуга

Фота ВІТАЛЬДА ЛЕЎЧУКА

Яны будуць наступныя

Важыў 32 кілаграмы

Успаміны Яна БАЙГУСА з Сухініч, народжанага ў Кнышэвічах у 1920 годзе.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Калі мне было тры гады, памерла мая мама, якая родам са Слоі была. Бацька ажаніўся з другою. Ён атрымаў калёнію ў Кнышэвічах і перабраўся туды. У школу, што стаяла ў Кнышэвічах з боку Слоі, я мала хадзіў, бо трэба было братоў даглядаць і дабытак. Як вырас, прыйшоў у Сухінічы ў прымы.

На калёніі жыў баец, ён дзяцей меў з партнёркай. На прадвесні прыйшлі немцы з украінцамі і абстралялі яго. Ён кінуў гранату, тады іх спалілі, а яе забралі ў Адэльск. І ў нас жыў рускі, памагаў за хлеб, дык зараз і нас забралі: таго рускага, мяне і цешчу, а жонка ў суседзяў была і так асталася; немцы з украінцамі вызначылі фурманкі і так нас завезлі. Тая суседка, што ёй хату спалілі, яшчэ пры нас у Адэльску была, але неўзабаве забралі яе ў Саколку і ў Саколцы забілі.

Нас у Адэльску трымалі 3-4 дні, пасля фурманкамі завезлі ў Саколку; у доўгім будынку, што і сёння пры рынку стаіць, трымалі бадай 9 дзён. Затым самаходамі завезлі нас у беластоцкую турму, адтуль, у сакавіку, завезлі чорным самаходам на станцыю, пагрузілі ў цялятнік і павезлі ў Германію. Спярша завезлі ў Штутгаф, там нас трымалі каля 20 дзён, адбылі каранцін. Пасля перавезлі ў Ноенгаме, а адтуль пасля трох тыдняў — у канцлагер Бухенвальд.

У Штутгафе адносіліся да нас дрэнна. У Ноенгаме — ні добра, ні блага; ганялі да работы. У Ноенгаме снеданне было ў 6 гадзін: давалі хлеб з кавай або манну. Калі выходзілі на работу іграў аркестр і нас у браме лічылі. У 10 гадзін прыносілі нам зноў есці. А ў 2 гадзіны поўдня прыганялі назад у барак, зноў іграў аркестр і нас лічылі. Давалі нам рыбны суп, па літру, а калі аставаўся, то яшчэ можна было браць. На суткі давалі булку хлеба. А ў Бухенвальдзе давалі кіёў, кіёў, кіёў... У Ноенгаме таксама білі, але ручніком.

У Бухенвальдзе давалі 100 грамаў хлеба; я атрымліваў яшчэ 100 грамаў, бо ў каменяломні працаваў. А біцця — то Госпадзі! Прыдзем з тунеля і носім нябожчыкаў. У тым лагеры, дзе я працаваў, не было печаў і спярша трупы вазілі ў печы, што былі ў іншых лагерах. Але як не стала самаходаў, то за дротам выкапалі яму як стадолу і туды трупы кідалі, як селядцоў. У суткі хавалі каля трохсот чалавек. І пакуль іх паносім, то яшчэ і з нашых каля 20 падала; як хто ўпаў, то яшчэ жывога кідалі.

Калі падыходзіў фронт, нас эвакуіравалі. Выгналі нас, мо з 10 тысяч, і гналі ў бок фронту. Некаторыя ўпалі, некаторых пабілі, бо было двух немцаў, што білі. Наша калона, мо з 300 чалавек, уцякла. Са мною ішоў чэх, які ў шпіталі быў, ён крыху правіянту назапасіў. Чэхі мелі з сабою ваненку, схопяць на ляту сабаку, скуру з яго здзяруць і мы тую скуру смакталі. Білі таксама авечак, што ў загарадах стаялі.

У немцаў жабравалі, але яны адказвалі: „Keine Brot", бо і самыя ўсё на картачкі мелі. Але давалі: то асыпку, то сырую бульбу. Толькі адна немка яйкам пачаставала. Начавалі ў стагах. Пасля даведаліся, што ў горадзе Рыза ёсць перасыльны пункт.

Але і ў рускіх было не лепш чым у немца, адно толькі што мову ведалі.

— Да, вас убить! — сказалі нам.

Забралі мяне ў армію, далі ружжо, папамучылі. У нейкі разбіты полк хацелі скіраваць. На лета трапіў я ў маёнтак, паганяў коней. Пасля кінулі мяне ў іншы маёнтак, але там мяне крыўка схапіла: рвала і чырвоным на двор гнала. Я кажу лейтэнанту:

— Або страляй, або дамоў адпраўляй!

І мяне вызвалілі. Мая цешча была ў іншым лагеры і яна таксама вярнулася дамоў. Салдат, што быў у нас жыў, татарын, цэлы час са мною быў, у каменяломні ў Бухенвальдзе запраўляў карбідныя лямпы; той карбід яму твар да сівізны пааб'ядаў. І як мы ўцякалі, яго арыштавалі і след па ім прапаў.

* * *

З дакументаў:

Арыштаваны 12 лютага 1944 года Крымінальнай паліцыяй у Адэльску, дэпартаваны ў канцлагер 29 сакавіка 1944 года Паліцыяй бяспекі ў Беластоку. 14 красавіка 1944 года — у Ноенгаме. 24 красавіка 1944 года — у Бухенвальд.

18.04.45 durch die US Army befreit.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

PS. У дарослага чалавека сам касцяк важыць каля 25 кілаграмаў. Калі такі чалавек важыць 32 кілаграмы, той касцяк прыводзяць у рух адно апошнія сем кілаграмаў... А. В.

Памятная сустрэча

Фота з сямейнага архіва Лідзіі ПАНЬКОЎСКАЙ

Зверху злева: Ян Федарук, Лідзія Асіпюк, Канстанцін Маркевіч, Ірэна Данілюк, Яўген Шварц, Анатоль Ціханюк, Васіль Дамброўскі, Уладзімір Зянюк, Ірэна Галёнка, Ніна Яліннік, Зінаіда Лабадзінская, Марыя Назарук, Марыя Стральчук, Галена Пракапюк, Ірэна Гіншт, Ян Мялешка, Вольга Парфянюк, Ян Сельвясюк, Яўгенія Корх, Таіса Мароз.

Залаты юбілей Гайнаўскага белліцэя, які адзначаўся 10 і 11 чэрвеня 2000 года, стаў зачэпкай для пазнейшых іншых сустрэч яго выпускнікоў. А сталася гэта м.інш. таму, што на згаданым з'ездзе не з'явіліся ўсе выпускнікі з паасобных класаў. Вось і ў абітурыентаў 1977 года ўзнікла ахвота спаткацца толькі ў сваёй кампаніі... Годам пазней, 12 жніўня 2001 года, пасля 24 гадоў ад развітання са школай, сустрэліся ў Гайнаўцы амаль усе вучні былога класа „б". На камерную сустрэчу ў пабе „Ляснічанкі" згаданыя выпускнікі запрасілі толькі свайго выхавацеля Яна Сельвесюка.

Расказвае былая вучаніца Лідзія Асіпюк (сёння Панькоўская):

— На з'езд прыехалі не ўсе вучні нашага класа, а толькі некалькі асоб. І нам вельмі захацелася спаткацца з усімі, бо наш клас быў вельмі дружны ды і добра мы вучыліся. І тыя што адсутнічалі, таксама рашылі спаткацца разам.

Галоўнымі ініцыятарамі і арганізатарамі сустрэчы сталі Ірэна Данілюк (цяпер Сакель) з Гайнаўкі і Толік Ціханюк (родам з Чыжоў, а цяпер палкоўнікам у Вроцлаве). Найперш трэба было даведацца пра прозвішчы і адрасы і гэтым занялася Вольга Парфянюк (цяпер Сянкевіч) — сяброўка з класа, якая сёння працуе настаўніцай у нашым ліцэі. На працягу двух месяцаў мы наладзілі сувязь, дамовіліся. Ірэна, якая вядзе кветачны магазін па вуліцы Верабея, сабрала грошы — па 70 злотаў, забраніравалі залу на 24 асобы. Дамовіліся, што з'язджацца будзем у адзіночку, без мужоў і жонак.

Усе ахвотныя спаткацца ў той дзень з'явіліся ў вызначаны тэрмін. Узаемна распазнаваліся, бо ж не бачыліся столькі гадоў. Наш выхавацель найхутчэй пазнаваў тых, хто або найлепш вучыўся, або з кім былі складанасці... Калі крыху перакусілі, наступіла самапрадстаўленне: кожны коратка расказваў пра сябе, як яму склаўся жыццёвы шлях. Высветлілася, што ў ліку выпускнікоў нашага класа ёсць прадстаўнікі шматлікіх прафесій. Многія вядуць уласныя фірмы, шмат працуе на дзяржаўных пасадах. Большасць жанчын здабыла педагагічную адукацыю; тры з іх навучае беларускай мове: Ніна Яліннік у Нарве, Ірэна Герасімюк у Арэшкаве і Оля Парфянюк у Гайнаўцы.

Сустрэча пасля 24 гадоў усім нам вельмі спадабалася і мы за тым, каб спаткацца так зноў. Веру, што наступнае спатканне адбудзецца і што тады з'едуцца ўжо ўсе выпускнікі нашага класа.

Запісаў Міхал Мінцэвіч

Апошні нонешні дзянёчак

Падпісваю я „Голас Радзімы" з Мінска і ў 44-м нумары ад 30 кастрычніка ў рубрыцы „Сямейныя абрады" прачытаў я вельмі цікавы артыкул п.з. „Провады ў армію". Калі ў канцы XIX стагоддзя землі Вялікага княства Літоўскага далучылі да Расійскай імперыі, ужо ў 1794 годзе адбыўся ў Беларусі першы рэкруцкі набор. У той час у армію забіралі на 25 гадоў; гэта не жарты, толькі жах. Бо ж адбубніўшы 25 гадоў цяжкай вайсковай службы, калі салдат не загінуў, вяртаўся дамоў амаль дзядулем і пераважна ўжо не заставаў бацькоў жывымі. Толькі за верную службу *за царя и отечество* салдат мог атрымаць кавалак зямлі, г.зв. маскоўскі агарод. Зямля тады цанілася, бо сяляне жылі пад паншчынай, якую цар адмяніў у 1864 годзе. Узрост навабранца не абмяжоўваўся і ад тысячы душ прызывалі 5-7 чалавек. У 1874 годзе была ўведзена г.зв. агульная вайсковая павіннасць і з таго часу салдаты служылі бадай 5-7 гадоў.

Тады рэкрута можна было замяніць іншай асобай з сям'і. Калісьці я чытаў апавяданне Льва Талстога п.з. „Чаму я люблю свайго брата", напісанае на гэтую тэму. Прызвалі ў армію старэйшага брата з адной рускай сям'і, а ён быў жанаты з маладой жонкай. Малодшы брат кажа яму: „Я цябе замяню". Пайшлі яны на прызыўны пункт, малодшы пайшоў служыць, а старэйшы вярнуўся дамоў. Такое было калісьці і не ведаю, ці сёння знайшоўся б такі добры і спагадлівы брат.

Аўтар артыкула Мікалай Котаў піша: *Пасля таго, як прызыўнік атрымліваў павестку, ён ехаў з родзічамі ў царкву. Будучы ваяр закупліваў некалькі свечак і ставіў іх перад абразом святога, які лічыўся яго абаронцам. За здароўе прызыўніка маліліся Богу, служылі абедню. Пасля, у наступныя два дні, ён наведваў блізкіх і сяброў. У час такіх паходаў бывалыя людзі давалі яму парады. За дзень да адпраўлення бацькі рабілі вечар провадаў — рытуальнае застолле. На Магілёўшчыне навабранца садзілі пад абразамі. Побач з ім сядалі бацька, маці, хросныя бацькі, бабка-пупарэзніца, дзядзькі, цёткі і іншыя сваякі. З другога боку садзілася моладзь. Бацькі абвязвалі прызыўніка ручніком, вешалі крыжык на шыю. Усе маліліся, каб Бог вярнуў яго на сваю зямлю. Калі ў хлопца была нявеста, яна абавязкова дарыла хусціну, якую сама вышыла. Госці частаваліся і спявалі песні „Апошні нонешні дзянёчак", „У нядзелю рана", „Ой, у лузе, пры даліне", „Праходзіць лета". У дзень ад'езду на зборны пункт бацькі благаслаўлялі сваё дзіця. На стол клалі каравай, запальвалі свечку. Маці здымала з кута абраз і давала прызыўніку троічы пацалаваць.*

Чытаючы гэтыя словы на сэрцы становіцца і цяжка, і лёгка. Цяжка, бо роднае дзіця адыходзіла аж на 25 гадоў і гэта было сямейнай трагедыяй. Лёгка, бо існавала любоў у сям'і і ў народзе, і нашы людзі трымаліся сваіх абычаяў і веры. У нас, у Дубічах-Царкоўных, у час маёй маладосці моднай была менавіта песня „Апошні нонешні дзянёчак", але на рускай мове. Мы, моладзь, заўсёды яе спявалі калі нехта ішоў служыць у войска, але не на 25, толькі на два гады. Сённяшняя моладзь не спявае ўжо гэтага, бо ў модзе толькі польскія напевы.

Мікалай Панфілюк

Фільмавы вечар

Снежань з яго зімнымі раніцамі, цёмнымі, рамантычнымі вечарамі большасці нам з'яўляецца часам падрыхтоўкі да калядных святаў. Каб адпачыць, адчуць прыгажосць зімы не толькі ў час вяртання з работы, варта прынамсі раз у тыдзень зайсці ў кінатэатр. На гэты тыдзень прапаную тры кінафільмы.

„Знакі" (*Signs*) аўтарства М. Найта Ш'ямалана, названага ў апошні час крытыкай „новым Спілбергам", прапаную аматарам добрага кіно, дзе дыялогі, дзея і музыка ўводзяць гледача ў зачараваны свет фантазіі, якая часам становіцца надта рэальнай.

Рэжысёр прадстаўляе гісторыю наезду іншапланецян на Зямлю, але не так як іншыя рэжысёры. Без вялікай колькасці спецыяльных эфектаў, выбухаў, з'яўленне касмічных прышэльцаў аглядаем праз прызму лёсаў сям'і фермераў з-пад Філадэлфіі.

Галоўнымі героямі з'яўляюцца аўдавелы пастар з двайміі дзяцьмі і яго брат — былы бейсбаліст. Аднойчы знаходзяць яны на сваім полі вялікі знак у форме круга. Пазней аказваецца, што падобныя знакі паявіліся на цэлым свеце і ніхто не можа адказаць хто ці што зрабіў гэтыя знакі. Адказ падае тэлебачанне: іншапланецяне рыхтуюцца да наезду на Зямлю. Астаецца толькі чакаць...

Пастар, які пасля смерці жонкі страціў веру ў Бога, рыхтуе сваіх блізкіх да спаткання з пазаземнай цывілізацыяй, можна сказаць нават да смерці. Як закончыцца гэтая гісторыя? Ці паводле такога сцэнарыя канец свету адбудзецца хутка, без выбухаў, а можа будзе зусім інакш? Пабачце самі!

На экране пабачым Мэла Гібсана, Хоакін Фенікс, Роры Калкіна і Абігейл Брэслін.

„Помсту" Аляксандра Фрэдры, перанесеную на экраны Анджэем Вайдам, можна аглядаць ужо ад кастрычніка. Пасля двух месяцаў аказалася, што маем дачыненне „толькі", а хтось можа сказаць што „аж", да літаральнага перанясення камедыі на экран. І хаця рэжысёр абяцаў зрабіць яе „сучаснай", паказаць сапраўдныя праблемы палякаў, асмяшыць іх нацыянальныя заганы, не зусім гэта яму ўдалося.

Аднак варта пайсці ў кіно. Пабачым класіку польскай літаратуры ў выкананні самых вядомых акцёраў: Януша Гаёса, Рамана Палянскага, Анджэя Сэвэрына, Рафала Крулікоўскага, Кацярыну Фігуру і Агату Бузэк. А і сам факт, што „Помсту" можна пабачыць, а не чытаць, для моладзі будзе стымулам, каб выбрацца ў кінатэатр.

На канец прапаную дэбютанцкі фільм маладога рэжысёра — Марка Раманка, які да гэтай пары займаўся відэакліпамі Дэйвіда Бові і Мадонны. Яго першы фільм — „Тэрміновае фота" (*One hour photo*) аказаўся вельмі ўдалым і цёпла прынятым амерыканскай крытыкай. Прычыніўся да гэтага галоўны герой, у ролі якога пабачым Робіна Уільямса, які паказаў майстэрства сваёй прафесіі, як і Коні Нільсен, Майкл Вартан і Гэры Коўл.

Сай Перыш, мужчына ў сярэднім узросце, акуратна апрануты, працуе ў фотамайстэрні. Прафесійны занятак адлюстраваны і ў яго прыватным жыцці: сцены яго кватэры заклеены здымкамі яго кліентаў — у прыватнасці Ніны і Віла, якім Сай зайздросціць сямейнага шчасця.

З часам фатограф улюбляецца ў Ніну, пачынае сачыць за ёй, адкрывае раман Віла і пасылае жанчыне доказы нявернасці яе мужа. Аднойчы крадзе з магазіна нож... Як закончыцца гэтая гісторыя, пабачце самі!

Паўліна Шафран

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

У Дубяжыне і Падбеллі

Не даязджаючы да вёскі, з грэблі прыкмячаю палоску асфальтнага палатна пракладзенага на дарозе ў Мокрае. А дубяжынская вуліца надалей застаецца брукаванай. Шыкарна памаляваная жалезная агароджа пры многіх панадворках нічуць не падыходзіць да калдобістага бруку. Шэры і сумны кантраст!

— Калі гэты асфальт паклалі? — пытаю свайго швагра.

— Восенню, мо два месяцы таму, — паясняе сваяк.

— А чаму вуліцы не асфальтавалі. Дубяжынцы ўзнос давалі?

— Не кожны акуратна паставіўся да прапановы гміны. Я 230 зл. заплаціў. Многія адмовіліся. Кажуць, што грошай не хапае. Ад Люшынай хаты да скрыжавання дарог, дзе канчаецца граніца гміны, паклалі, — паясняе швагер. Кіламетраў шэсць будзе.

— Пасля выбараў войт грошы знойдзе і вуліцу асфальтуе?

— Войта змянілі. Папярэдні не дбаў пра нас, хаця ягоныя карані па бацьку з Дыдуляў выходзяць. Жанчыну выбралі. Дарога побач могільніка патрабуе рамонту. Адны ямкі. Фуру паламаць можна.

— Каго радным выбралі?

— Двух кандыдатаў было на тры вёскі, — гаворыць швагер. — Янка Авярчук, наш сусед і солтыс з Казлоў. Казлоўцы свайго солтыса хітруном палічылі і на Янку галасавалі. Ён радным стаў. Гаворку то ён мае. Можа чагосьці дабіцца.

Хутка прайшоў час і я пачаў збірацца на цягнік у Чаромху.

Стаяла халоднае дажджлівае надвор'е. На пачакальні ў Падбеллі на прыпынку жывой душы не было. Білетная каса не працавала. Дзверы, без замка і клямак, расчынены. Сцены шэрыя з плямамі абляцеўшай фарбы. Расклад руху цягнікоў нечытэльны. Акно кватэры, дзе калісьці жыў білетны касір, забітае дошкамі. Сумны вобраз сучаснай чыгункі.

Рэйкавы аўтобус з Беластока прыехаў пунктуальна. У Падбеллі злезлі некалькі пасажыраў. Я пагрузіўся з роварам. У Чаромху прыехалі паводле раскладу.

Уладзімір Сідарук

Парваная тэлефонная лінія

Побач шашы з Нараўкі у Гайнаўку каля Навасадаў прабягае тэлефонная лінія ў пару дзесяткаў тэлефонных правадоў і даўжынёю ў 9 кіламетраў. Цяпер яе правады ў шматлікіх месцах парвалі, між іншым ля Скупава ды ў Белавежскай пушчы. У некаторых месцах стаяць толькі слупы зверху з ізалятарамі, але ўжо без правадоў. Па ўсяму відаць, што пра тэлефонную лінію не клапоцяцца. З кожным годам правадоў усё менш і менш. Іх раскрадаюць. А на тых, што ацалелі яшчэ ад разбурэння, там-сям ляжаць апаўшыя галіны дрэў.

Янка Целушэцкі

Патрыёт

Адзін беларус ад нас яшчэ перад выбарамі купляў у мяне „Ніву"; гэта, вядома, была шышка, не просты мужык. І калі ён паспяхова прайшоў выбарчы адбор і стаў свайго роду начальнікам, тады чамусьці перастаў купляць „Ніву". І тут просты вывад: „Ніву" ён купляў дзеля сваёй прапаганды, каб людзі думалі, што ён такі шчыры беларус, каб у выбаршчыкаў атрымаць як найбольш галасоў. І штучка ўдалася. А мы яшчэ крытыкуем Лукашэнку, але ж яму падобных і ў нас не бракуе. Мо не праўда?

Мікалай Панфілюк

Факты і высновы

У каго цэнтр Еўропы

Як паведамляе „ЛіМ", беларускія вучоныя правялі новыя разлікі і з вялікай доляй дакладнасці вызначылі геаграфічны цэнтр Еўропы. Ён знаходзіцца ў Віцебскай вобласці на паўднёвы захад ад Полацка побач з возерам Шо.

Словам, як бы ні дуліся на непапраўнага Лукашэнку ганарыстыя еўрапупікі, а цэнтр Еўропы застаўся ў руках крывіцкага віцязя.

Сідар Макацёр

Вер – не вер

Астроне, уцешыўся я аднойчы, рана ўстаўшы. А прычынай быў сон. Перада мной высачэзная, стромая гара. Выгляд яе прыгожы, уся парослая зялёнай травой і такая ж зялёная вакол яе вялікая плошча. Я мушу ўзлезці на вярхушку тае гары. Але як туды ўзабрацца? Перамагаю страх і пачынаю асцярожна, памалу падымацца ўверх, але чым далей, дык лягчэй і смялей мне. І так апынуўся я на вярхушцы. Стаю, гляджу з вышыні ўніз, а ўкругавую такая прыгажосць! Адпачыў я, падмацаваўся псіхічна і фізічна, ну, і пара вяртацца. Ізноў страшнавата стала — як жа я злезу з такой вышыні! І на маё здзіўленне, вяртанне аказалася і хуткае, і лёгкае. І я, шчаслівы, стаю ля падножжа гары.

Мікалай

Мікалай! Твой сон крыху супярэчлівы. Перад табой была высачэзная, стромая гара, а калі сняцца высокія горы, абазначаюць яны цяжкую працу і смутную долю. Аднак жа твая гара была прыгожая, уся парослая зялёнай травой, ды і плошча каля яе таксама была зялёная. А што абазначае зелень? Тое, што ў тваім жыцці паявілася надзея на добрыя змены.

Далей. У цябе ўзніклі нейкія цяжкасці. Яны мучаць цябе, бо ты ж ведаеш, што мусіш узлезці на вяршыню тае гары, але не ведаеш, як гэта зрабіць? Нарэшце твая адвага і асцярожнасць дазваляюць табе перамагчы страх і памалу падняцца наверх, тым больш, што чым вышэй ты ішоў, тым было табе лягчэй. Ты дайшоў да самай вярхушкі, а гэта абазначае, што пераможаш усе перашкоды і будзеш шчаслівым.

А калі дадаць да таго прыгожы ландшафт, які ты аглядаў зверху ўніз, стоячы на вяршыні гары, дык і зусім будзе добра. Тая прыгажосць пра кепскае не можа сведчыць. Можна сказаць, што ты „заправіўся" на той гары (адпачыў, падмацаваўся фізічна і псіхічна) і таму, хаця страшнавата табе стала, як толькі падумаў ты, што трэба будзе сысці з тае гары, усё пайшло гладка, лёгка і хутка.

Астрон

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Трыста дваццаць дзевяць выкрутак

— Адзін юрлівы немец, — кажу Агаце, не без дайпрычыны, — вёў дзённік, у якім запісваў усе выкруткі, якія стасавала ягоная дзеўка, каб адмовіцца ад любошчаў. І пасля адправіў гэта ў газету.

— Хіба не дзённік? — не на тое звярнула ўвагу мая жонка, на што я намякаў. І ў яе тоне прагучала зларадпасць. — А колькі яму было гадоў? Ці не ў тваім ён узросце?

— Дваццаць тры, каб ты ведала. 54 разы былі ў іх новыя прасціны, сем раз кабетка была спечаная на сонцы, пяць раз не хацела знішчыць сабе прычоскі, ну і, вядома, дваццаць раз балела ёй галава. А калі нават штосьці ў іх атрымлівалася, дык заўважаў: „З трыццаці сямі раз, дык дваццаць шэсць было зусім безнадзейна, восем раз безупынна прыгадвала мне, што ў нас патрэскалася столь, а сем раз мусіў яе будзіць каб паведаміць, што ўжо кончыў".

— Ну, дык у нямкінь, кажуць, ніякі не тэмперамент. Але тут справа, здаецца, больш у вечнай незадаволенасці таго фацэта! Узяў бы што, замест потым яшчэ пісаць і па газетах рассылаць. Ці гэта табе кагосьці не прыводзіць на думку?

— У сэнсе пісання? — я ўжо і нярады быў, што крануў якраз гэту тэму.

— Некаторыя мужчыны сваю ўсю энергію накіроўваюць не туды, куды выпадае.

— То што, Агатка, мне зноўку смецце вынесці? Ці падлогу працерці ў салоне?

— А каб цябе! Гэта называецца „салон"? Каб пайшла была за Шурыка Назарэза, дык, пэўна, і салон мела б, і машыну з клімай! А не гэты стары „Паланез", якім не паедзеш, бо ногі прадзьме вецер!

— Такія і ногі! Як той стары „Паланез", куплены дваццаць гадоў таму. Але ж дараванаму каню ў зубы не заглядаюць.

Бліснула сваёй асляпляльнай фарфоравай усмешкай мая каханая палова, адбліснуў я сваёй зубной парцалянай. Гэта называецца з'едлівая ўхмылка. З'едлівая, бо зубы з'елі, усміхаючыся штучна.

Агата надзьмула свае нафарбаваныя вусны. Замоўкла, ды толькі на хвіліну. А збіраўся я ўжо выйсці з хаты.

— Ты што пра нейкія нямецкія выкруткі! Ты што, ува ўсім вінаваты бабы? Адно нам галовы баляць?

— Гэта, так сказаць, перыядычная справа ў цябе. Праўда, больш у сувязі са святамі. Пірог падыходзіць, мяса марынуецца, прас нагрэты да беласці...

— Дачакалася-я-я я! Дык жыві адзін. Сам сабе прасуй, сам сабе пячы булкі... Або лепш ідзі жыць да Міколы Здунюка. Вось табе і пара!

— Думаеш, жылі б адны? — я таксама зачопны зрабіўся. — У Міколы шмат сяброўак. Пашкадуюць беспрытульных.

Агата трэснула дзвярыма ў ванную. Чую, напускае ваду ў ванну.

— Ты што, тапіцца будзеш? З адчаю?

Вада, чую, б'е ў ванну быццам Ніягара.

— А буду. З такім тыпам, што мне жыццё паламаў... Жыць адхочацца! — Агата высунула нос з-за дзвярэй.

Хацеў я да яе зайсці, ды дзверы ледзь мне нос не прыцялі.

Праз хвілін дваццаць, калі я ўжо стаў падрэмваць перад тэлевізарам, у пакой зайшла мая жонка ў ядвабнай сукенцы, чысценькая і надухмяненая „Опіумам".

— Ну, якія ў цябе будуць сёння выкруткі, Ваня?

Вандал Арлянскі

Крыжаванка



Гарызантальна: 2. ноўгарадскі князь, заснавальнік дынастыі, 4. спосаб прыгатавання лекавых рэчываў, 6. размах далоні, 7. контур, 9. вялікая пасудзіна для вадкасцей, 11. нечаканы варожы выпад, 12. бакавая частка дарогі, 13. адзінка вымярэння атмасфернага ціску, 15. літаратурны псеўданім Алаізы Пашкевіч, 17. частка тулава ад шыі да крыжа, 18. прыстасаванне прыёмніка да частаты перадатчыка, 19. частка канечнасці пасля ампутацыі.

Вертыкальна: 1. літаратурны псеўданім Кандрата Атраховіча (1896-1991), 2. беластоцкае беларускае радыё, 3. круты спуск, абрыў, 4. індыйскі штат з Джайпурам, 5. палітычная паліцыя Івана Грознага, 6. заходнееўрапейскі князь, 8. між Венерай і Марсам, 9. Сеід Алі-Махамед, іранскі заснавальнік бабізму (1820-50), 10. паўкруглае пасляледавіковае ўглыбленне ў прывяршыннай частцы гор, 14. між Ціхім і Атлантычным акіянамі, 16. аўсападобная расліна сямейства злакавых, 17. ціхаакіянская прамысловая рыба. (Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 44 нумара

Гарызантальна: вестка, Варшава, Рывера, Лісабон, аншлаг, Накуру, навязка, шчасце, чаравік, трыста.

Вертыкальна: Авалон, прысак, тамбур, Варна, Сіваш, кірка, Навара, Лозьва, градка, анчар, „Урсур", Унеча.

Рашэнне: **Вочы вераць сабе, вушы — іншым**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

З гісторыі беларускага нацыяналістычнага руху на Беласточчыне

W nawiązaniu do artykułu Pani Redaktor Pauliny SZAFRAN w nr 48 "NIWY" p.t JUBILEJNY KANCERT KAŁASKOU " śmiem zauważyć co następuje :

1.Ja wprzeciwoeństwie do Pauliny Szafran nie mam zastrzeżeń co do sposobu prowadzenia jubilieuszowego Koncertu przez Panią A.Ś./ustawa o ochronie danych osobowych/.
Powierzenie prowadzenia Koncertu byłemu członkowi zespołu KAŁASKI /były bo uczy się poza Białymstokiem/ uważam za wspaniały pomysł / w tym miejscu ukłon Panu Syczewskiemu/.

W nawiązaniu do artykułu Pani Redaktor Pauliny SZAFRAN w nr 48 „Niwy" p.t. JUBILEJNY KANCERT KAŁASKOU śmiem zauważyć co następuje:

1. Ja wprzeciwieństwie do Pauliny Szafran nie mam zastrzeżeń co do sposobu prowadzenia jubileuszowego Koncertu przez Panią A.Ś.(ustawa o ochronie danych osobowych).

Powierzenie prowadzenia Koncertu byłemu członkowi zespołu KAŁASKI (były bo uczy się poza Białymstokiem) uważam za wspaniały pomysł (w tym miejscu ukłon Panu Syczewskiemu).

To że w trakcie Koncertu prowadząca wtrąciła kilka razy tzw „rusycyzmy". To ma być główny zarzut ?

Przepraszam a kto tak bardzo w Białymstoku potrafi mówić czystym językiem białoruskim?

Mój Boże. Młodzież naszą pozbawiono przecież mozliwości nauki języka rosyjskiego nie mówiąc o białoruskim. Stopień opanowania języka Białoruskiego przez prowadzącą Koncert uważam za bardzo wysoki. Chylę czoła przed Panią Anią. Moje dzieci ojczystego języka nie umieją.Ubolewam.

2. Przejęzyczenie „Białostockiego — Białoruskiego " podniesione w artykule jako wielki zarzut w stosunku do prowadzącej Koncert. Zarzutten jest żenujący, cynicznie niski. W czołowych programach TVP i nie tylko, zawodowi prezenterzy przejęzyczają się bowiem w dużo poważniejszych kwestiach i co? I nic. Uznaje się to za zwyczajne przejęzyczenie, do poprawienia. Robić z tego zarzut to zagrywka haniebna.

3. Czy nie można było do prowadzenia Koncertu znaleźć innej w domyśle chyba lepszej prezenterki. Można Pani Paulino pod warunkiem, że prowadzenie Koncertu powierzono by córce Pani Walentyny (ustawa o ochronie danych osobowych) z Zarządu Głównego BTSK.

Napastliwy(niegodny) tekst stworzony został przez Panią Paulinę Szafran tylko dlatego, że do prowadzenia Koncertu jubilieuszowego KAŁASKOU wybrano inną osobę tj. członka tegoż Zespołu.

4. Najbardziej haniebnym elementem w powołanym artykule redakcyjnym jest sformułowany przez Paulinę zarzut słabego opanowania przez Prezenterkę Języka polskiego.

Jak za dawnych czasów; jak chciano utrącić dyskutanta(białorusina) to rzucano ironicznie „ty nie umiesz mówić po polsku" co jakoby równało się z wrzuceniem dyskutanta do niższej kategorii. Brawo za argumenty.Jak innych nie ma to dobre i takie.Byle dokopać.

Panie Redaktorze naczelny.

Dopuścił Pan do opublikowania na łamach „NIWY" tekstu depczącego cudzą godność.Poziom Łukaszenki ? Zaatakował Pan (jak zwykle) co prawda pośrednio Przewodniczącego BTSK Pana J.Syczewskiego jako organizatora jubilieuszowego Koncertu za dobór osoby do prowadzenia tegoż Koncertu. Nota bene ocena osoby która prowadziła Koncert dokonana przez Pana Przewodniczącego w sali koncertowej na zakończeniu uroczystości była diametralnie inna. t.j. pozytywna bardzo pomimo, co jak podkreślił Pan Syczewski było kilka wtrąconych rusycyzmów.

Dopuścił Pan zatem do opublikowania przez Panią Red.Paulinę Szafran i d i o t y z m ó w nie mających nic wspólnego z odczuciami widowni. Ja bawiłam się świetnie moi znajomi też.

Zrobił Pan tym samym z siebie idiotę w każdym calu.

Poza wnioskiem o opublikowanie mego listu na łamach „NIWY" (możliwie bez skrótów redakcyjnych) wnoszę aby Pan jako Redaktor Naczelny przeprosił w jakiejś formie Panią prezenter A. Ś. (ust o ochr.d.osob.).

Uważam ponadto, że Pani Paulina Szafran nie może (nie powinna) być w dalszym ciągu redaktorem „NIWY".

Jej pożal się Boże twórczość z nr 48 niewiele ma wspólnego z rzetelnością dziennikarską.

Jeżeli Pan tego nie zrobi to będę (wbrew dotychczasowym poglądom) w grupie tych co uważają (w grupie niemałej) „NIWĘ" i jej Redakcję za p o b o l s z e w i c k ą (niepotrzebną absolutnie ale politycznie konieczną) pozostałość,takie jakieś tam „bołoto".

Córka Pani Walentyny lub nawet Pani Paulina Szafran mogą prowadzić następny jubilieuszowy Koncert KAŁASKOU.Powinny jednak występować w Zespole turlając się autokarami na festyny, brać także udział w próbach.

Proszę tylko do następnego jubilieuszu zaniechać ubliżania młodym społecznikom. To że coś robią dla tej kultury to chwała im za to.

Tylko komu zatem służy Redakcja „NIWY"

Jakim żesz to PANOM.

Do wiadomości.

1. Pan Jan Syczewski — Przewodniczący BTSK

2. Pan Jerzy Półjanowicz — V-ce wojewoda Białostocki (był na Koncercie

3. pani barbara Ciruk — Poseł na sejm (na koncercie była)

4. Pani Ala Kamieńska m.Koźliki gm. zabłudów

Zinaida Nowicka, Białystok

PS. Ліст друкуем без скарачэнняў, з захаваннем правапісу аўтаркі.

Ад рэдакцыі: Мяркуйце самі, хто тут які.

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

На Паўночным полюсе сустракаюцца два белыя мядзведзі:

— Я вельмі люблю калядны перыяд, — кажа адзін.

— Чаму?

— Бо я тады не галодны. За дзень, бывае, з'ядаю па трох Дзедаў Марозаў.

* * *

— Чаму заглядаеш у мае карты?

— Бо свае ўжо бачыў.

* * *

Члена ЦК мелі ўзнагародзіць чарговым медалём, аднак полы яго касцюма былі поўнасцю абвешаны папярэднімі адзнакамі і на новае не было ўжо месца. Выхад са склаўшайся складанасці абмяркоўвае палітбюро.

— Пакончыць з ім і паставіць помнік! — запрапанаваў адзін з сакратароў.

* * *

— Што чуваць у твайго брата?

— Выехаў у Амерыку; мо ўжо пяць гадоў там...

— Як яму шанцуе?

— Выдатна!

— А што: не піша?

— А пра гэта адкуль ведаеш?

— Бо калі б было дрэнна, напісаў бы.

ISSN 0546-1960